БЕЛАРУСБАНК

Уладзімір Ліпскі



# ГРОШЫК І ТАЯМНІЧЫ КОШЫК

## Азбука фінансавай граматнасці ад «Беларусбанка»




**На правым баку купюры адлюстравана Белая вежа ў Камянцы, помнік архітэктуры 13 стагоддзя. На адваротным баку – кола, скураны пояс, рэканструкцыя старажытнага ўмацаванага пасялення Берасця.**







**На правым баку купюры адлюстравана Спаса-Праабражэнская царква, помнік архітэктуры 12 стагоддзя. На адваротным баку – Крыж Еўфрасінні Полацкай, кнігі, пячатка Францыска Скарыны.**







**На правым баку купюры адлюстраваны палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі, помнік архітэктуры 18–19 стагоддзяў. На адваротным баку – звон, Тураўскае Евангелле, краявіды старажытнага Турава.**






БЕЛАРУСБАНК







На правым баку купюры адлюстраваны Мірскі замак, помнік архітэктуры 16 стагоддзя. На адваротным баку – пяро, папера, ліра, ноты, лаўравыя галінкі.









На правым баку купюры адлюстраваны замак Радзівілаў у Нясвіжы, помнік архітэктуры 16 стагоддзя. На адваротным баку – музычныя інструменты, слуцкі пояс, тэатр батлейка, калядныя каза і зорка.







На правым баку купюры адлюстраваны Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П. В. Масленікава. На адваротным баку – пячатка Магілёва, залаты ключ, пабудовы.







На правым баку купюры адлюстравана Нацыянальная бібліятэка Беларусі. На адваротным баку – пяро, чарніліца, кніга, галінка папараці.



Уладзімір Ліпскі



# Грошык і таямнічы кошык

## Азбука фінансавай граматнасці ад «Беларусбанка»

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2017

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
Л61

Мастак К. Білан
Кансультанты – група па фінансавай граматнасці
Галаўнога офіса ААТ «ААБ Беларусбанк»

Адкрытае акцыянернае таварыства
«Акцыянерны Ашчадны банк "Беларусбанк"». УНП 100325912.

---

Літаратурна-мастацкае выданне

**Ліпскі** Уладзімір Сцяпанавіч

**Грошык і таямнічы кошык**

Азбука фінансавай граматнасці ад «Беларусбанка»

*Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту*

| | |
|---|---|
| Рэдактар | М. М. Шавыркіна |
| Дызайн і мастак вокладкі | В. К. Вінобер |
| Мастацкія рэдактары | В. К. Вінобер, А. А. Левіцін |
| Камп'ютарны набор | М. М. Шавыркінай |
| Камп'ютарная вёрстка | А. А. Левіціна |
| Карэктар | Т. А. Іванова |

Падпісана да друку 29.09.2017. Фармат 60×90 1/8.
Папера мелаваная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,0. Ул.-выд. арк. 15,5.
Тыраж 1000 экз. Заказ 121.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 14.11.2014.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

6+

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «СУГАРТ».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/175 ад 01.04.2015.
Вул. Валгаградская, 6, корп. 2, каб. 287, 220012, г. Мінск.

**ISBN 978-985-471-999-3**

© Ліпскі У. С., 2017
© Білан К., ілюстрацыі, 2017
© Афармленне. РУП «Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"», 2017

# ДАРАГІ СЯБАР!

Я звяртаюся да цябе менавіта так, таму што ўпэўнены: праз некаторы час мы з табой абавязкова станем добрымі сябрамі.

Маё імя, мяркую, табе вядома. Я самы вялікі і магутны банк нашай краіны — «Беларусбанк». Ты, напэўна, неаднойчы бываў у мяне ў гасцях разам з маці альбо татам. Больш скажу, да мяне заглядвалі твае бабулі і дзядулі. Так, мне шмат гадоў — сёлета я адзначаю 95-годдзе, уяўляеш?

Амаль стагоддзе я займаюся грашыма: выдаю іх, прымаю, зберагаю, пералічваю. Увесь гэты час я заўсёды побач з кліентамі. Ведаеш чаму «Беларусбанк» заўсёды побач? Бо я працую ў кожным куточку нашай краіны: прысутнічаю і ў вялікім горадзе, і нават у самай маленькай вёсцы. Кожны насельнік можа карыстацца маімі паслугамі паўсюдна: можна зайсці ва ўтульнае аддзяленне альбо адкрыць на сваім камп'ютары інтэрнэт-банкінг ці ўсталяваць сабе на тэлефон мой дадатак «М-банкінг». Усё вельмі проста. І далей будзе яшчэ прасцей, абяцаю.

Ведаеш, я пражыў дастаткова многа і магу цябе запэўніць: змены ва ўсім адбываюцца вельмі хутка. І ўжо праз некаторы час для таго, каб выключыць святло ў пакоі, табе дастаткова будзе націснуць адну кнопку ў тэлефоне; каб набыць марожанае ў краме, не спатрэбіцца шукаць у кішэні манеты ці папяровыя грошы, бо іх проста не будзе, і ты разлічышся з дапамогай карты або тэлефона.

Усё мяняецца. Кожны дзень мяняюся і я. Вельмі хачу табе пажадаць, каб і ты рабіў тое самае — гэта вельмі важна. Спазнавай свет, абавязкова будзь дапытлівы, заўсёды вучыся новаму, многа вандруй і абавязкова чытай добрыя кнігі. Вось, напрыклад, гэтую. Яна вельмі цікавая і, самае галоўнае, яна навучыць цябе правільна абыходзіцца з грашыма. А калі ўзнікнуць пытанні, прыходзь да мяне, не саромейся, я дапамагу. Тым больш што мы з табой будучыя сябры.

Твой БЕЛАРУСБАНК

# БЕЛАРУСБАНК

У слове «БАНК» – чатыры літары. Калі іх правільна разгадаць, то можна багата чаго даведацца пра банк.

**Б** – **будынак.** Банк – гэта своеасаблівы дом, у якім галоўны ўладар – Грошы. Яны паступаюць туды ад людзей і арганізацый на асобныя рахункі. Захоўваюцца там, «вырошчваюцца» і працуюць. У банку служаць людзі розных прафесій, але ўсіх іх можна назваць БАНКІРАМІ.






**А** – **ахоўнік, абаронца.** Банк ахоўвае, сцеражэ, вартуе, беражэ, шануе ўклады асоб фізічных (кожнага чалавека) і юрыдычных (арганізацый, прадпрыемстваў).



**Н** – **накапленні.** У банку накопліваецца прыбытак ад тых грошай, якія пакладзены людзьмі і арганізацыямі на захаванне. Гэтыя даходы пасля выплачваюцца ўкладчыкам.



**К** – **капітал, кліенты.** Капітал банка – сума грошай, унесеных кліентамі на свае рахункі.

БАНК – гэта агульны, усіхні кашалёк, своеасаблівая народная і дзяржаўная скарбонка.

# ЗМЕСТ

1. СВЕЖАЯ КАПЕЙКА ................ 6
2. ХІТРАЯ СКАРБОНКА.............. 12
3. ГРАШОВЫ КУБ .................... 18
4. ЧАРОЎНАЯ КАРТКА.............. 24
5. САКРЭТЫ КУПЮР.................. 30
6. РАТАЎНІК КРЭДЫТ .............. 36
7. ДЗІВА-МУЗЕЙ ....................... 42
8. КУРС — ДАРОГА РУБЛЯ ........ 48
9. СЛУГА І ДАБРАХОТ .............. 54
10. КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ ........ 58
11. СПАГАДЛІВЫ СТРАХ .......... 64
12. САМЫ ВЯЛІКІ КАШАЛЁК ...................... 68



# 1. СВЕЖАЯ КАПЕЙКА





Жыў-быў Грошык.

Чакайце, чаму жыў-быў? Ён жа і цяпер жыве і будзе жыць з людзьмі, колькі будзе стаяць свет.

А яму, нашаму беларускаму Грошыку, дужа багата гадоў. Толькі давайце адразу ўцямім, што грошы і Грошык – не зусім адно і тое.

Першыя манеты з'явіліся ў Старажытнай Лідзіі яшчэ да нашай эры. Да таго гандляры карысталіся рознымі менамі. Я табе дам солі, а ты мне – шкуркі звяроў. Я табе – зерне, а ты мне – дарагіх каменьчыкаў для дзявочых убораў. А пасля ўжо з'явіліся грошы.






**Цана** – грашовае выражэнне вартасці тавару. Вы прыходзіце, напрыклад, у кнігарню і бачыце каля кожнай кнігі цану. Яна розная для асобнага выдання і залежыць ад таго, на якой паперы кніга надрукавана, колькі ў ёй старонак, які тыраж. Улічваюцца таксама ганарары аўтару, мастаку, фатографу, вярстальніку, карэктару. Усе расходы складваюцца разам, дзеляцца на колькасць выпушчаных экзэмпляраў – і атрымліваецца цана кнігі.

Не паверыце, у Полацку, старажытным беларускім горадзе, хлопчыкі пайшлі лавіць рыбу на Заходнюю Дзвіну. На беразе пачалі шукаць для нажывы чарвякоў. Капанулі. А там... скарб! Ажно дваццаць кілаграмаў арабскіх дырхемаў. Што вы думаеце, гэтыя чужынскія манеты таксама хадзілі на нашай зямлі. Чаму? А таму што па тэрыторыі Беларусі праходзіў некалі водны гандлёвы шлях. Ён называўся – «з варагаў у грэкі». І нашы гандляры-мянялы аддавалі свой тавар за розныя грошы – дырхемы, дынары, плашкі.



## Сакрэты ад Грошыка

Назва старажытнай манеты «грош» паходзіць ад лацінскага слова «гросус», што азначае «тоўсты, велізарны». Першыя ў свеце грошы – вялікія срэбныя манеты – пачалі чаканіць 900 гадоў таму ў італьянскім горадзе Ге́нуя. Неўзабаве іх пачалі вырабляць па ўсёй Еўропе. У 14 стагоддзі гэта валюта трапіла ў Беларусь і хутка стала асноўным плацежным сродкам сярод нашых суайчыннікаў.

## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся імя новага казачнага героя.



Пазней, гадоў шэсцьсот таму, на Беларусі з'явілася і свая валюта – грош. Вось з тае пары і аб'явіўся Грошык – герой нашай казкі.

Грошык – быццам гаспадар над грашыма. Ён – нейкі таямнічы, чароўны, дзівосны дух. Як Дамавік, што жыве ў кожнай хаце і ахоўвае яе. Як Балотнік, што вечна жыве ў дрыгве і заўсёды баіцца, каб чалавек не асушыў яго балота. Як Вадзянік – уладар рэк, азёраў. Там, дзе ён, вада ніколі не прамярзае, а добрым людзям заганяе ў сетку рыбу.

А дзе жыве наш Грошык?

Ды паўсюль, дзе ёсць патрэба ў грашах. Чалавек працуе – і Грошык круціцца каля яго. Можа падмагаць. А калі што не так, дык і перашкоды ўчыніць, і чалавек меней атрымае грошай.

Ідзе сям'я ў магазін – і Грошык з ёй. То раіць, падказвае, а то і падбухторвае, каб залішне патраціліся.

Ох, як важна пасябраваць з гэтым валютным духам!





## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- Ката ў мяшку не купляюць.
- Грошы камень б'юць.
- Лёгка грош пражыць, а як яго нажыць.
- Мяркуй, круці, а за тавар плаці.





Не ведаю, як вам, а мне Грошык уяўляецца гэткім зямным калабком. Вельмі вёрткім, няўлоўным. Не такім, як у вядомай казцы, – хлебным, круглым, якога абхітрыла і з'ела Ліса.

У Грошыка не проста вочы, а нейкія касмічныя ліхтарыкі, якія ўсё прасвечваюць. Гэткія прыборчыкі начнога бачання. Вушы ў яго, вядома ж, не такія вялікія, як у слана, але вельмі чуйныя. Можа пачуць на вялікай адлегласці, калі што з грашыма не так робіцца.

Ножкі ў Грошыка кароткія. Ён толькі на малыя адлегласці хадзіць здатны. А калі што якое, дык ногі можна ўвабраць у сябе ды выпусціць крылы. Тады і самая хуткая ракета не дагоніць яго.





## Сакрэты ад Грошыка

У старажытнасці людзі ў якасці грошай выкарыстоўвалі самыя розныя рэчы. Гэта маглі быць шкуркі звяроў, жамчужыны, ракавінкі і яшчэ шмат чаго. Тубыльцы з вострава Яп у Ціхім акіяне расплачваліся велізарнымі камянямі з круглымі адтулінамі пасярэдзіне. Зрушыць з месца такія магутныя камяні было немагчыма. Таму пасля завяршэння здзелкі на іх проста выбівалі імя новага ўладальніка.

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!



**Пакупкі** бываюць планавыя, абавязковыя і стыхійныя, нечаканыя. Умейце рабіць пакупкі, ведайце сямейны бюджэт ды не вельмі дакучайце бацькам, каб рабілі пакупкі па вашых капрызах.

Грошык мае яшчэ шмат усялякіх кнопачак. Абяцаў пра кожную з іх расказаць сакрэт.

Адзін сакрэцік Грошык даверыў мне. У яго, значыцца, на галаве, дзе чубчык, ёсць кнопачка памяці. Адтуль, з базы памяці, ён можа выдаць якія заўгодна звесткі.

Грошык дазволіў мне даткнуцца да той кнопкі. І я пачуў даўні народны жарт. Вось як суседзі пагаварылі-пасмяяліся:

– Ці быў на базары? – Быў! – Што ж ты купіў? – Казу! – Колькі аддаў? – Сем капеек! – А дзе ж каза? – Ды прадаў. – А за колькі? – За пяць капеек! – Навошта так багата страціў? – Нічога, абы свежая капейка!..







Грошык нечакана знік. Ён, бачыце, можа стаць і невідзімкам. А я ўсё думаю, для чаго ён мне вывернуў з памяці даўно заржавелы жарт пра свежую капейку? Мо таму, што ўсе мы павінны дбаць, каб грошы нашы заўсёды рухаліся і прыносілі толькі радасць. Хай сабе купюры будуць і не новыя, але заўсёды жаданыя і свежыя, заробленыя, а не дармавыя...

## Фінансавая азбука



**Капейка** – грашовая адзінка, дробная разменная манета. Яна з'яўляецца адной сотай рубля. Капейкі звычайна робяць з металаў, але бываюць і папяровыя.



# 2. ХІТРАЯ СКАРБОНКА



Пад Новы год Грошык падарыў Янку дзівоснага зялёнага слоніка. І папярэдзіў:

– Гэта не цацка, а скарбонка. Твой таямнічы кошык для грошай.

Пачаў Янка разглядаць падарунак. І праўда: на спіне слоніка – доўгая шчылінка. Зазірнуў туды, а там – цемра, загадкавая цішыня. І як бы чуецца нечы голас: «Мне адзіно-о-ка-а. Падмажы-ы!..»

Грошык патлумачыў:

– Бачыш, твой грашовы кошык пусты. Яму сумна.

– А давай я пакладу туды свае грошы, – прапанаваў Янка.

– Дзе іх узяў?

– Тата даў. Дзядуля даў. Вось мой капітал, – Янка дастаў з кішэні джынсавікаў грошы.

– О, ды ў цябе розныя манеты.

– Ага, і рубель, і два.

– Кідай іх у скарбонку! – загадаў Грошык.

Як толькі Янка апусціў апошнюю манету ў адтулінку, слонік весела затрубіў. Вочы яго адкрыліся. А хобат узняўся ўгору. Вось гэта цацка!



## Сакрэты ад Грошыка

Звычайна дзеці трацяць кішэнныя грошы на марожанае, батончыкі і іншыя прысмакі. Але ж калі выкарыстоўваць свае дробныя капіталы з розумам, можна істотна разбагацець, як гэта зрабіў амерыканскі хлопчык Джо Мадалена. Ён быў заўзятым калекцыянерам і за кішэнныя грошы ўвесь час набываў бейсбольныя карткі і коміксы. Праз некалькі гадоў ужо валодаў адной з самых вялікіх калекцый у свеце.

Калі Джо вырас, ён прадаў усю сваю калекцыю і стаў мільянерам.

Цікава, а як забраць цяпер грошы са скарбонкі? Янка пачаў абследаваць зялёнага слоніка. І адкрыў тайну. Аказваецца, трэба адкруціць левае вуха. Як толькі Янка хацеў гэта зрабіць, слонік заплюшчыў вочы і з іх пакаціліся буйныя слёзы. Слонік плакаў.

Янка пабег да таты, мамы і ўсё расказаў ім. Тата мудра патлумачыў:

– У цябе, сынок, вельмі хітрая скарбонка. Калі ў яе хаваеш грошы, яна радуецца, калі забіраеш – плача.

– Чаму так? – зацікавіўся Янка.

– А таму, што грошы – гэта не цацкі. Яны не для гульні, а для жыцця.

Татавы словы прымусілі Янку задумацца. І ён пачаў задаваць бацьку разумныя пытанні.

– Тата, вы мне даяце грошы на марожанае, на машынкі, на абеды ў школе. А хто вам іх дае?

– Нам ніхто не дае. Грошы мы зарабляем! Я – інжынер, мама – доктар. Нам за працу выдаюць зарплату.

– І вы кладзяце свае грошы ў скарбонку?

Мама падтрымала цікавую размову:





## Фінансавая азбука



**Скарбонка** – пасудзінка для збору вольных грошай у запас. Скарбонкі бываюць з розных матэрыялаў і самых адмысловых формаў, напрыклад у выглядзе слоніка, сабачкі, савы. Але самая надзейная скарбонка для грошай – гэта банк.



– Ага, Яначка, ты наша скарбонка. Цябе трэба прыгожа і цёпла адзець, абуць. Смачна накарміць. Купіць табе цацкі, кніжкі...

– А яшчэ з табой трэба схадзіць у басейн, кіно, магазін, на атракцыёны ў парк, – падтрымаў маму тата і дадаў: – Ды ўсюды – білецікі, чэкі, квіткі. За іх патрабуюць грошы.

– Дык давайце вашы грошы ў маю скарбонку. Во слонік узрадуецца. Затрубіць сваю песню на ўвесь мікрараён.

– У нас, Янка, свае скарбонкі-кашалькі, – сказала мама. – А астачу кладзём у банк.

Грошык у гэты час сядзеў на шафе, за крышталёвымі вазамі, і як бы дырыжыраваў размовай. Махне ў бок таты – той гаворыць. У бок мамы – яна тлумачыць. У бок Янкі – ён нечым цікавіцца. Атрымлівалася вельмі ж карысная размова, якой раней ніколі не было.





## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі і выслоўі?

- Хавай грош на чорны дзень.
- Сцеражы бацькаву капейку, то і сваю здабудзеш.
- Грошы лік любяць.
- Гнацца за доўгім рублём.

## Фінансавая азбука

**Сямейны бюджэт** – улік усіх даходаў і расходаў сям'і, напрыклад, за месяц. Складзіце грошы, якія атрымаюць тата і мама ў форме месячнай заработнай платы. Калі яшчэ былі якія-небудзь грашовыя прыбыткі, скажам, падарункі на дзень народзінаў ці прэміі, то і іх прыплюсуйце. Атрымаецца даход. А потым падлічыце ўсе расходы. І вы зразумееце, што такое сямейны бюджэт.





# Школка Грошыка

**1.** У Янкі ёсць манеты: сем – па дваццаць капеек, пяць – па пяцьдзясят, тры – па рублю, дзве – па два рублі. Колькі ўсяго грошай у Янкі? Дзе іх лепей захоўваць: у кішэні ці ў скарбонцы?

**2.** Складзіце ваш сямейны бюджэт. Што цікавага вы даведаліся?

**3.** Ці маеце вы кішэнныя грошы? Ці «слухаюцца» яны вас?

Па падказцы Грошыка сям'я пачала рашаць адну важную задачу, пра якую Янка ніколі не думаў. Вось яна.

Тата-інжынер атрымаў за месяц зарплату. Ды маміна праца доктара ацэнена ў рублях. Калі скласці ўсё разам, то гэта і будзе сямейны бюджэт, сямейная скарбонка.

– Ух ты, каб мне столькі грошай! – выгукнуў Янка і абхапіў сваю бялявую галаву абедзвюма рукамі.

– І што б ты з імі рабіў? – пацікавілася мама.

– Што, што?.. Скупіў бы ўсе цацкі ў магазіне. У прыдачу – усе цукеркі, усё марожанае. А яшчэ – усе білеты на ўсе атракцыёны ў аквапарку. Во павесяліўся б!

Тата і не супраць, каб так было, але ўзяў паперу, аловак. Намаляваў на белым аркушы прыгожую карову. На ёй напісаў: «Сямейны бюджэт». Карова падала голас: «Му-у-у!..» Як бы казала: «Ну-у-у, пачынайце мяне даіць...»







## Фінансавая азбука



**Зарплата** – грашовая аплата працы. Колькасць зароблених грошай залежыць ад таго, якая ў работніка адукацыя, колькі гадоў ён працуе па сваёй прафесіі, як выконвае свае службовыя абавязкі, якую займае пасаду.



Ад той сумы, якая складала сямейны бюджэт, тата і мама давай адымаць грошы на абавязковыя патрэбы. За кватэру трэба заплаціць, за ваду, за газ, за электрычнасць, за інтэрнэт. І гэтая сума поўнасцю залежыць ад жыльцоў.

– І ад мяне? – здзівіўся Янка.

– А як жа, – сказаў тата і патлумачыў: – Ты чысціш зубы, забыўся на гэты час закрыць кран. Некалькі рублёў, лічы, паплылі ў трубу. Ты не выключыў святло ў спальні, пабег у залу глядзець тэлевізар. Лічыльнік святла накруціў лішнія кілаваты. За іх – нам плаціць. Гэта ўсё роўна, што даіць карову не ў вядро, а на зямлю...



Янка сядзеў задуменны. Мама ўзяла слова:

– А яшчэ з нашага бюджэту трэба запоўніць халадзільнік.

Пальцаў у мамы не хапіла, каб пералічыць усё, што патрэбна купіць для сняданкаў, абедаў, вячэры.

## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся, хто самы багаты ў свеце.

1, 2 1, 3 1



# Сакрэты ад Грошыка

Першыя ў свеце скарбонкі з'явіліся за некалькі стагоддзяў да нашай эры ў Старажытнай Грэцыі. Яны ўяўлялі з сябе невялікія вырабы з гліны, якія формай нагадвалі будынак храма ў мініяцюры. У такіх скарбонках меўся прарэз для кідання манет, а вось адтуліна для выемкі грошай адсутнічала. Дастаць назапашанае можна было, толькі разбіўшы скарбонку. У наш час найбольш папулярныя скарбонкі ў выглядзе свінкі. Мода на такія ёмістасці зарадзілася ў Вялікабрытаніі 200 гадоў таму.





Калі назвалі абавязковыя траты і пакупкі, сямейны бюджэт вельмі «пахудзеў». А з яго яшчэ трэба ўзяць грошы на жаданыя пакупкі. Астачу вырашылі пакласці ў банк.

Грошык шчаслівы, што сваёй хітрай цацкай-скарбонкай узбудзіў Янку на сур'ёзны роздум.

Былі задаволены і тата з мамай. Сын зацікавіўся сямейным бюджэтам. І зразумеў, чаму слонік плакаў і не хацеў аддаваць яму грошы. Яны ж не забава. Грошы не для гуляў. Пра гэта думаў і тата, калі прыгадаў прымаўку свайго старога бацькі: «Багаты, калі нікому не вінаваты».

## Фінансавая азбука



**Кішэнныя грошы** – грошы, якія бацькі выдаюць вам на асабістыя патрэбы, напрыклад, каб купіць у школьным буфеце булачку, сок ці кніжку ў краме. Звычайна вы хаваеце гэтыя грошы ў сваю кішэню. Вось табе і кішэнныя грошы. Навучыцеся іх беражліва, з карысцю траціць.

# 3. ГРАШОВЫ КУБ



Грошык дазволіў Янку націснуць на жоўтую кнопачку свайго смартфона. І на экране тут жа высвеціўся шчаслівы Бураціна. У яго было столькі залатых манет, колькі пальцаў на руцэ – пяць! Такім багаццем адарыў Бураціна сам сеньёр Карабас Барабас, доктар лялечных навук. Што ж купіць за іх? О, Бураціна парадуе свайго тату Карла новай курткай. Сабе купіць ледзянцоў-пеўнікаў і новую азбуку.

А куды ж схаваць астачу?

Толькі пра гэта падумаў Бураціна, як перад ім паўсталі рабаўнікі – ліса Аліса і кот Базілія. Пачалі падвучваць пасадзіць манеты ў зямлю, тры разы сказаць: «Крэкс, фэкс, пэкс», пасыпаць зверху соллю, паліць вадой і ісці спаць. Раніцай вырасце на тым месцы грашовае дрэва...





## Школка Грошыка

**1.** Што такое абавязковыя плацяжы і жаданыя пакупкі? Якія грошы можна назваць вольнымі і дзе іх можна вырошчваць?

**2.** Рашыце задачу: вы паклалі ў банк, напрыклад, 500 рублёў пад 8 % гадавых. На колькі вырастуць вашы грошы: 1) праз месяц; 2) праз паўгода; 3) праз год?

**3.** Каму можна даверыць банкаўскую тайну: тату, маме, сябру, суседу, незнаёмцу на вуліцы ці пасажыру метро?





Грошык раптам выключыў свой мульцік і спытаў Янку:

– Верыш, што на дрэве замест лісця будуць грошы?

– Я ведаю, што гэта прыдумка Алісы і Базіліа, каб забраць у Бураціна залатыя манеты.

– Ты хлапчынка-малайчынка, – пахваліў Грошык свайго сябра, – таму я адкрыю табе тайну, дзе і як можна вырасціць грошы. Хочаш?

– Яшчэ як хачу!

Грошык імгнення націснуў на нейкую кнопачку за вухам, як бы ўключыў тэлефон. Некаму нябачнаму загадаў падаслаць крылатую машыну. Грошык і Янка ляцелі над вялікім горадам, і хлопчык не пераставаў дзівіцца:

– Колькі дамоў, вуліц, машын!

– А ўсё гэта, Янка, пабудавана, куплена за грошы. Разумееш, каб жыў чалавек, патрэбны ежа, паветра. Каб жыў горад, патрэбны электрычнасць, газ, вада, розная тэхніка, машыны, магазіны, заводы, школы... А на ўсё гэта – падавай вагоны грошай.



– Што, праўда ёсць вагоны, якія возяць грошы? – перапытаў Янка.

– Розным транспартам катаюцца грошы. Пра гэта мы з табой неяк паразмаўляем, а цяпер – увага, мы ідзём на спуск...

**Аферта** – публічная працэдура, калі банк мяняе ўмовы захоўвання ўкладаў. Аферта можа быць пісьмовай і вуснай.

**Гарантыя банкаўская** – гэта абавязацельства банка перад кліентамі. Гарантыя – гэта парука, залог, умова, абавязак. Банк гарантуе кліентам захаванне і вяртанне іх укладаў, налічэнне пэўных працэнтаў. У нашай краіне дзейнічае Закон «Аб гарантаваным вяртанні банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб».





Грошык і Янка, калі выйшлі з машыны, апынуліся перад велічным будынкам, падобным на зіхатлівы куб-шасціграннік. На адным з яго квадратаў сонечнымі промнямі высвечвалася назва «Банк».

– Вось тут, Яначка, і вырошчваюць грошы, – сказаў Грошык.

– А чаму ў гэтага дома шмат граняў?

– О, Янка, ведай: у банка шматгранная праца. Сёння я паведаю табе пра адзін бок гэтага куба. Называецца ён Клад.

– Я чытаў пра розныя скарбы. Людзі закопвалі каштоўнасці ў зямлю. Хавалі ў лесе, – пачаў расказваць Янка. – Адзін скнарлівы дзядзька ішоў ад сваёй лясной схованкі дамоў, а на яго напалі ваўкі...

– Так было раней, да банкаў, – супакоіў Грошык. – Цяпер вось гэты грашовы куб мае сваіх дзетак-кубікаў па ўсёй нашай краіне. Каля дзвюх тысяч!

– І што, ва ўсіх ёсць скарбы?

– Яшчэ якія! Туды людзі смела здаюць свае вольныя грошы. І не баяцца, што прападуць...



## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі і выслоўі?

- Будзем мы – будуць грошы.
- Малады назбірай, а стары пражывай.
- Капейка рубель беражэ.
- Узбіцца на капейку.

## Фінансавая азбука



**Накапленні** – гэта «лішнія» грошы. У вас усё куплена, за ўсё заплачана. Засталіся вольныя грошы, ваш капітал. За гэтыя грошы можна купіць нейкую рэч, якую вы даўно хацелі мець, але не было пэўнай сумы грошай. А можна накапленні пакласці ў банк.






Калі ўвайшлі ў прасторнае фае банка, Грошык спытаў у Янкі:

– У цябе ёсць вольныя грошы?

– Ну, мама давала мне на школьныя абеды, на марожанае, на шакаладку, – пачаў тлумачыць Янка. – Я не ўсе патраціў, зэканоміў.

– Малайчына, гэта і ёсць твае вольныя грошы, – пахваліў Грошык сябра. – Хочаш, каб яны выраслі?

– А як гэта?

Грошык падвёў Янку да зашклёнага бар'ерчыка. За акенцам сядзела сімпатычная дзяўчына ў беласнежнай блузцы. Яна міла ўсміхнулася:

– Слухаю вас, маладыя людзі.

– Мы хочам зрабіць грашовы ўклад у вашым банку.

– Калі ласка, – зноў прыветліва ўсміхнулася спецыяліст банка.

Праз колькі хвілін аформіла патрэбныя дакументы. Аддаючы іх, патлумачыла:

– Ваш дзіцячы ўклад прыняты пад высокі працэнт гадавых. Да шаснаццаці гадоў...

## Сакрэты ад Грошыка

40 % насельніцтва Беларусі захоўваюць свае грошы ў «Беларусбанку».

Янка ўпершыню пачуў, што яго паважліва называюць не толькі па імені, але і па бацьку, з прозвішчам, як дарослага. А спецыяліст працягвала:

– Вашы сённяшнія грошы вырастуць у вялікую суму. Віншую вас!

Калі Янка і Грошык выйшлі з банка, здаецца, само сонца вітала іх. Стала неяк святлей, весялей. Янка перапытаў:

– Гэта праўда, што мае грошы вырастуць?

– Не сумнявайся, – супакоіў яго Грошык. – Тут робяць уклады ўсе дарослыя людзі, хто мае вольныя грошы. Тут захоўваюць свае заробкі заводы, магазіны, тэатры, розныя ўстановы.






**Тайна банкаўская** – гэта калі банк захоўвае ў тайне звесткі пра ўсе аперацыі кліента (па ўкладах, крэдытах, плацяжах). Такія звесткі банк можа паведаміць толькі пэўным дзяржаўным органам у выпадках, прадугледжаных законам. Сам кліент сваю банкаўскую тайну можа даверыць каму захоча.

**Уклад** – пэўная грашовая сума, якая пакладзена ў банк дзеля яе захавання і павелічэння. Банк часова карыстаецца грашыма і на гэтую суму выплачвае працэнты.

## Школка Грошыка



Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся назву банка.
Што вы ведаеце пра гэты банк?




– І што, банк усім налічвае працэнты? Ва ўсіх грошы растуць?

– Грашовы куб – выгаднае сховішча для кожнага кліента! – супакоіў Грошык.

– А дзе ж банк бярэ грошы, каб выдаць усім надбаўкі да ўкладаў? – зацікавіўся Янка.

– Слухай, кліент банка, гэта добра, што ў цябе ўзнікла новае пытанне, – супыніў сябра Грошык. – На яго я адкажу крыху пазней. А цяпер запрашаю ў дзіцячае кафэ «Казка».

Яны ўвайшлі ў расквечаны вясёлкай будынак. Іх адразу задурманіў пах свежых булачак і малінавага варэння.



**Ячэйка** – банкаўскі сейф, дзе можна захоўваць каштоўныя рэчы, дакументы, упрыгожанні, грошы. Ячэйка закрываецца на два ключы. Адзін застаецца ў банку, а другі – у таго, хто арандуе ячэйку. Банк нясе адказнасць за рэчы ў ячэйцы. Гэта банкаўская паслуга платная.

**Укладчык** – уладальнік грашовага ўкладу ў банку.




## Сакрэты ад Грошыка

Менавіта ў банкаўскіх злітках золата больш за ўсё. Таму яно і завецца «чыстым» золатам, і мае пробу 999,9. Гэта значыць, што ў 1000 грамах злітка ўтрымліваецца 999,9 грама золата.

# 4. ЧАРОЎНАЯ КАРТКА





Калі крыху пад'елі ў кафэ, Грошык і Янка пачалі размаўляць. Грошыку падабалася Янкава цікаўнасць да ўсяго. А Янка радаваўся, што яго новы сябар ведае шмат таямніц. Асабліва пра грошы.

– Слухай, Янка, – кажа Грошык, – чым адрозніваецца мара ад явы?

– Ну, як гэта сказаць, – задумаўся Янка, ажно вушы яго пачырванелі.

– Ну, пра мару можна марыць, спраўдзіцца яна ці не… А ява – гэта вось тое, што цяпер… От сядзім мы ў кафэ «Казка» і ямо марожанае…

– Слухай, ты – філосаф!.. – пахваліў Грошык свайго вучня, – правільна разважыў. Але не быў бы я Грошыкам, каб не скіраваў твае думкі крыху ў іншы бок.

– Як гэта? – зацікавіўся Янка.

– Глядзі: каб нейкая твая мара здзейснілася, хочаш не хочаш, а спатрэбяцца грошы. Ты, казаў, марыш мець гоначны веласіпед.

– Ага, мару.

– Дык вось, на тваю мару трэба адкладваць, збіраць грошы.

– Вырошчваць у банку, – падказаў Янка.

– Малайчына, твой уклад у банку пачаў ужо расці… Карацей, грошы на любую тваю мару – гэта заўтрашні дзень. А за яву, за сённяшнія расходы, трэба разлічвацца зараз.

## Сакрэты ад Грошыка

Сёння «Беларусбанк» мае адну з найбольш разгалінаваных сетак банкаматаў па ўсёй Беларусі. Першы ж банкамат «Беларусбанка» пачаў працаваць у 1998 годзе. Цяпер ён займае ганаровае месца ў музеі банка.

# Школка Грошыка

**1.** Навошта плацежным банкаўскім карткам надаецца сакрэтны пін-код?

**2.** Як патлумачыце такую фразу: «Укладваць грошы ў дзяцей – і патрэбна, і выгадна, і карысна»?

**3.** Падумайце, што вы маглі б зрабіць, калі б у вас была банкаўская картка «Дзіцячая».




Грошык кіўнуў афіцыянту:

– Давайце рахунак.

– Навошта ён нам?.. Нічога ўжо не хочацца... – няўпэўнена, ціха сказаў Янка.

– Рахунак, мой сябар, гэта паперка, на якой пазначана сума платы за нашу ежу.

Пакуль Грошык тлумачыў, ім прынеслі рахунак. І тут Янка пачуў ад Грошыка фразу, якую адразу не зразумеў.

– Мы будзем разлічвацца не наяўнымі грашыма, а банкаўскай карткай.

– Добра, – пагадзіўся афіцыянт і тут жа падаў невялікі пераносны касавы апарат.






**Банкаматы** – гэта аўтаматычныя прылады для выдачы наяўных грошай. Яны ўяўляюць з сябе маленькія банкі, усталяваныя ў мнагалюдных месцах (у метро, на вакзале, у магазіне). Устаўляеце ў электронна-механічную шафу плацежную картку, набіраеце свой пін-код і патрэбную суму грошай – і праз секунды атрымлівайце купюры. Праз банкамат можна праводзіць розныя плацяжы.







Грошык выняў з таямнічага кошыка пластыкавую картку, утыркнуў яе ў прораз апарата. На цыферблаце набраў нейкія чатыры лічбы, вядомыя толькі яму. А пасля націснуў на зялёную клавішу. Апарат ціха загудзеў і выдаў квіток, на якім была выбіта сума аплаты.

– І што, ужо заплачана?.. Без папяровых грошай?.. Можам ісці?.. – загарэліся вочы ў Янкі.

– Так, мы нічога нікому не павінны.

– Крута! – выгукнуў Янка і тут жа азадачыў Грошыка: – От бы мне такую чароўную картку.

– А што, банк можа выдаць. Толькі туды ты павінен прыйсці з татам ці з мамай.

– Я ўгавару іх. Яны паслухаюцца мяне, – хіба не скакаў Янка.



фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!



## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- Бачылі вочы, што куплялі.
- Схавай тры грошы на зязюльку.
- Розуму грашыма не заменіш.
- Купіў бы цяля, ды купіла няма.

**Пін-код** – пароль з чатырох лічбаў, які адкрывае доступ да вашых грошай па плацежнай картцы. Пажадана лічбы пароля не запісваць, а памятаць.

**Рахунак** – дакумент, у якім пазначана сума грошай, якая павінна быць выплачаная за што-небудзь. Напрыклад, выдавецтва вырашыла надрукаваць кнігу «Грошык і таямнічы кошык». Складаецца рахунак: кошт паперы, ганарар аўтару і мастаку, расходы на набор тэксту, друкаванне. Усё разам і будзе рахунак на выданне кнігі.




АЗБУКА ФІНАНСАВАЙ ГРАМАТНАСЦІ АД «БЕЛАРУСБАНКА»

– А цяпер паслухай мяне, – па-настаўніцку строга сказаў Грошык. – На дзіцячай картцы можа быць змешчанае таё фота. А калі захочаш, можна змясціць твой малюнак, выяву твайго любімага героя з мультфільма...

– О, клёва!.. Слухай, Грошык, а ці дазволіш твой партрэт наляпіць на маю банкаўскую картку? – Янка ўмольна пазіраў на свайго сябра.

– Што ж, я згодзен, – адказаў Грошык і прадоўжыў свой урок: – Толькі памятай: банк аформіць табе картку, калі нехта з тваіх бацькоў з'яўляецца кліентам банка.

– І я тады змагу з карткай, без грошай хадзіць у магазін, у школьны буфет? – здзівіўся Янка.

– Можаш, калі бацькі перавядуць на тваю картку пэўную суму грошай. Тады ты зможаш нават аплаціць размовы па мабільніку, паслугі за інтэрнэт.






## Сакрэты ад Грошыка

Усе банкаўскія карты свету маюць стандартны памер – 5×8 сантыметраў.

Жыхар Каліфорніі Уолтар Каванах трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса за сваю любоў да плацежных карт. Ён назбіраў 1397 карт.

У сярэднім 6400 аперацый у месяц ажыццяўляе кожны банкамат.





Грошыку было вельмі прыемна, што Янка так жыва цікавіцца ўсім, ён з кожнай хвілінай рабіўся ўсё больш бадзёрым, натхнёным:

– Ды ты, Яначка, са сваёй карткай будзеш хадок хоць куды, дзе прымаюць да аплаты плацежныя карткі. Можна яшчэ мець картку навучэнца. Па ёй цябе прапусцяць праз турнікет у школу, абслужаць у бібліятэцы...

– Ух ты! – вочы Янкі блішчалі, як зоркі ў небе.

– Толькі я цябе павінен папярэдзіць, – Грошык строга паглядзеў на Янку: – Картку не губляць! Нікому не даваць для карыстання! А пін-код – сакрэтны пароль з чатырох лічбаў – трэба трымаць у памяці. Яго могуць ведаць, апрача цябе, толькі мама і тата. Зразумеў?

Янка ўзяў руку пад казырок, як гэта робяць ваенныя:

– Дакладна зразумеў, мой шэф!

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!



## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы прачытаеце назву часопіса, у якім упершыню была надрукаваная казка Уладзіміра Ліпскага «Грошык і таямнічы кошык».



## Фінансавая азбука



**Чэк** – гэта квітанцыя з пазначэннем сумы грошай, якую трэба заплаціць за тавар або паслугу. Гэта і талон з касы, які сведчыць, што пакупнік заплаціў наяўнымі грашыма ці па картцы за сваю пакупку.

**Плацежны тэрмінал** – спецыяльная прылада, з дапамогай якой можна самастойна аплачваць разнастайныя паслугі: мабільную сувязь, інтэрнэт, дадатковыя заняткі ў школе. Плацежны тэрмінал можа знаходзіцца ўнутры альбо за межамі банка і дазваляе выкарыстоўваць банкаўскую картку ці наяўныя грошы.



Грошык быў задаволены кемлівым вучнем. Можна і развітвацца, але ён вырашыў задаць яшчэ адно пытанне:

– А як ты думаеш, чаму банк робіць дзецям свае мудрыя карткі?

Янка задумаўся:

– Ну-у-у, можа, гэта... Каб дзецям не даваць грошы... Думай, дзе іх схаваць... Каб не згубіў... Каб хто не ўзяў...

– Ты правільна разважаеш, Янка, – пахваліў Грошык. – А зараз прыкінь: калі грошы насіць у кішэнях, сумках, кашальках, хочаш не хочаш, а купюры зношваюцца, псуюцца, рвуцца. Іх спісваюць. А каб зрабіць новыя грошы, патрэбны вялікія фінансавыя сродкі.

– Мы можам пабываць там, дзе друкуюцца грошы? – Янка ўмольна зірнуў на Грошыка.

А той толькі загадкава ўсміхнуўся.



## Сакрэты ад Грошыка




**Картка «Дзіцячая»**

Картка БЕЛКАРТ «Дзіцячая» выпускаецца спецыяльна для непаўналетніх ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў. Афармляецца ў якасці дадатковай да рахунку аднаго з бацькоў.



**Інтэрнэт-банкінг** – аказанне банкаўскіх паслуг праз інтэрнэт. Кліент можа аплаціць пэўныя плацяжы, атрымаць інфармацыю пра свой уклад, здзейсніць аперацыі па пераводзе грашовых сродкаў з плацежнай карткай.

# 5. САКРЭТЫ КУПЮР



– Што такое купюра? – спытаў Грошык у Янкі.

– Хэ, гэта легкатня, – Янка аж пстрыкнуў пальцамі. – Азначае: купі, Юра! Штонебудзь купі, калі ёсць купіла.

– Гумарыст ты, аднак.

– Ды мы з татам ездзілі на свята гумару ў Аўцюкі.

– А купюры бралі з сабой?

– Як жа ж, бралі і аддавалі.

Грошык дастаў з таямнічага кошыка розныя папяровыя грошы. Янка паказаў, якія яны бралі ў дарогу.

– Ты, здаецца, хацеў ведаць, як робяцца грошы? – нагадаў Грошык.

– Ага, вельмі хачу. Мо і я калі сам зрабіў бы іх.

– А вось пра гэта нават і не думай.

– Чаму?

– Людзей, якія спрабуюць рабіць грошы, называюць фальшываманетчыкамі. І вельмі жорстка караюць.

– Ого, можа, і ў турму адпраўляюць?

– Як ты кажаш, лёгка і... надоўга.

– А чаму так строга? – дапытваўся спалоханы Янка.

– Зразумей, грошы – нацыянальная каштоўнасць. Зацвярджаюцца дзяржавай. Ахоўваюцца законамі. Яны – знак багацця, прадмет абмену.

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!



## Школка Грошыка

**1.** Колькі абарончых сакрэтаў вы знайшлі на вашых купюрах? Пералічыце сакрэты, патлумачце, для чаго яны патрэбны.

**2.** Якімі фарбамі надрукаваны вашы купюры? Памятайце, што змяшаныя разам дзве-тры фарбы ўтвараюць новы колер.

# Сакрэты ад Грошыка

Банкнотамі або купюрамі называюцца грашовыя знакі, выраблены з паперы, тканіны і нават з пластыку. Слова «банкнота» складаецца з двух англійскіх слоў: bank – «банк» і note – «распіска». Гарантам каштоўнасці такіх грошай выступае цэнтральны дзяржаўны банк. Банкноты лягчэйшыя за манеты, зручнейшыя ў абароце і не такія дарагія ў вытворчасці. Менавіта ў банкнотах выходзяць самыя буйныя наміналы грашовых адзінак.



Грошык папрасіў Янку ўважліва паглядзець на грошы і спытаў:

– Што ты найперш бачыш на купюрах?

– Ну, лічбы: пяць, дзесяць, дваццаць, пяцьдзясят...

– Правільна. Гэта іх намінал. А што яшчэ бачыш?

Янка запнуўся, злёгку пачырванелі вушы.

Ён думаў і маўчаў. А можа, проста маўчаў. Грошык узяў ролю настаўніка:

– Глядзі, па малюнках на грашах можна правесці экскурсію па Беларусі. Во, на купюры ў сто рублёў – старажытны замак Радзівілаў у Нясвіжы. Бываў там?

– Неа.

– О, там цяпер музей! Паходзіш па яго залах – і як бы адкруціш гадзіннік гадоў на трыста назад.

– Цікава! – толькі і вымавіў Янка.

– На беларускіх грашах, бачыш, ёсць Мірскі замак, палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку... Велічныя будынкі. Важныя для нашай краіны аб'екты. Помнікі архітэктуры...





**Купюра** – грашовы знак, папяровыя грошы.

– А хто гэта ўсё прыдумляе?

– Заказ на грошы робіць Нацыянальны банк Беларусі, галоўны банк краіны. Над эскізамі купюр працуюць мастакі розных кірункаў: жывапісцы, графікі, дызайнеры, гравёры...

– Яны намалююць, і можна ўжо друкаваць грошы? – нецярпліва перапытаў Янка.

– Ага, як бы не так, – Грошык, як дзед-усявед, таямніча падміргнуў.

– Трэба спачатку прыдумаць сакрэты. Для кожнай купюры – свае.




Грошык падняў угору дваццацірублёвую купюру, павярнуў яе да сонца:

– Што бачыш на белым полі збоку?

– Дзверы, купал будынка.

– Такія самыя, як і на выяве?

– Ага.

– Дык ведай, Янка: гэта і ёсць вадзяны знак. На ім як бы размыты вадой малюнак, які ёсць на самой купюры. Там можа быць выява ўсяго малюнка ці нейкай часткі яго. Як кажуць, фрагмент.

– А як робіцца гэтае дзіва? – не цярпелася ведаць Янку.





## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- Не грошы нажылі чалавека, а чалавек грошы.
- Хоць не багат, ды нікому не вінават.
- Грошай – куры не клююць.
- Твае грошы – мой тавар.

Фінансавая азбука



## Манетны двор –

спецыяльнае прадпрыемства, на якім вырабляюць манеты, ордэны, медалі ды іншыя дзяржаўныя знакі. Даўней такія манетныя двары былі ў Брэсце, Гродне.









– Слухай, усё адразу будзеш ведаць – хутка састарышся, – Грошык калабком пакаціўся па пакоі, стаў на свае кароткія ножкі і зафыркаў, як вожык. – От вырасцеш, от вывучышся, от станеш мастаком, от тады і даведаешся, як рабіць вадзяныя знакі. А цяпер пакуль запомні: вадзяны знак – сакрэт купюры. Яго падрабіць амаль немагчыма.

– Якія яшчэ сакрэты ёсць?

– Глядзі, на ўсіх дарагіх купюрах выціснуты абарончыя блішчастыя палоскі, як бы нечыя таямнічыя сляды. Яны розных колераў.

– Здорава!

– Прыгледзься, сакрэтаў на грашах шмат. Ёсць нават мікратэкст, які можна разгледзець і прачытаць толькі пад павелічальным шклом...

– Вось бы паглядзець, як друкуюць грошы... – Янка нагадаў Грошыку сваё даўняе жаданне.

– Вядома ж, Яначка, грашовая друкарня – вельмі сакрэтнае прадпрыемства. Яе называюць Манетны двор. Але для цябе чаго не зробіць Грошык са сваім таямнічым кошыкам.

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!



Грошык надзьмуўся, як лятальны паветраны шар. Толькі і прапыхцеў:

– Сядай у кошык! Хутчэй!..

Калі прыляцелі на Манетны двор, Грошык папярэдзіў:

– Зараз мы станем невідзімкамі. Не палохайся. А галоўнае – не падавай голасу. Пазірай і запамінай...

Яны тут жа апынуліся ў вялізным будынку з высокімі столямі. Вось да металічнага станка падвезлі вялікі рулон паперы.

Грошык шапнуў Янку: «Паперу на кніжкі робяць з драўніны. А для грошай – з лёну ці бавоўны».



## Сакрэты ад Грошыка

### Адкуль з'явіўся Манетны двор?

Слова «манета» ў перакладзе з латыні азначае «перасцерагальная» або «дарадчыца». Такі тытул мела рымская багіня Юнона – жонка грамавержца Юпітэра. Лічылася, што яна неаднойчы папярэджвала рымлян пра землятрусы, атакі ворагаў і іншыя напасці. На рымскім Капітоліі каля храма Юноны Манеты размяшчаліся майстэрні, дзе чаканілі металічныя грошы. Па месцы іх вырабу прадукцыя майстэрняў таксама атрымала назву «манета», якая потым трапіла ў большасць еўрапейскіх моў. А ў англійскай мове ад гэтага слова ўтварылася назва грошай – money.







# Сакрэты ад Грошыка

**Першыя беларускія банкноты**

Першыя папяровыя грошы незалежнай Рэспублікі Беларусь былі выпушчаныя ў 1992 годзе. На адным баку гэтых банкнот быў адлюстраваны нацыянальны герб, а на другім – жывёлы, якія сустракаюцца ў беларускіх лясах. Такія купюры жартоўна назвалі «зайчыкамі».

# Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы прачытаеце прозвішча вядомага казачніка, які напісаў казку «Срэбная манетка». Якія казкі гэтага слыннага аўтара вы чыталі?






Рулоны паперы спецмашына парэзала на вялікія аркушы. Яны паступілі на друкарскую машыну. Адтуль па транспарцёры аркушы выплывалі бясконцай, шырокай стужкай. На іх ужо бачныя былі грошы ва ўсёй сваёй красе.

Наступная машына выстуквала на грашах спецыяльныя нумары. Пасля аркушы былі разрэзаныя па памерах грошай, і іх пачалі збіраць у пачкі ды запакоўваць.

Усюды шчоўкалі аўтаматы-лічылкі.

Зазірнулі Грошык з Янкам і на склад, дзе захоўваюцца аддрукаваныя грашовыя знакі. Тут Янка, як убачыў горы грошай, ледзь не парушыў тайную дамоўленасць – маўчаць. Хіба не крычаў ад здзіўлення...

# 6. РАТАЎНІК КРЭДЫТ



Янку карцела ведаць, куды ж ідуць, хто забірае новенькія, надрукаваныя грошы з Манетнага двара.

А Грошык не спяшаўся расказваць. Ён разумеў: кнігу адразу не прачытаеш. Трэба асэнсоўваць кожную старонку. А ў грошай свая кніга жыцця.

– Дык вось, Яначка, – пачаў таямнічую гаворку Грошык. – Усе асігнацыі з друкарні асядаюць у сховішчах банкаў. Вялікую частку з іх забірае Крэдыт...

Як толькі ён прамовіў слова «крэдыт», пачулася загадкавае крактанне:

– Крэ-крэ-крэ... Дыт-дыт... Хто мяне турбуе?..

Да іх выйшаў старэнькі дзядок з сівой барадой ажно да падлогі. На галаве – карона, падобная да банкаўскага куба. А вочы маладыя, іскрыстыя.

– Чым магу служыць? – перапытаў Крэдыт.

– Ды вось мой сябар Янка хоча пра вас даведацца, – патлумачыў Грошык.

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!



## Школка Грошыка

**1.** Што можна купіць за крэдытныя грошы? Падумайце, калі выгадна ўзяць крэдыт, а калі лепей пакарыстацца дамашняй скарбонкай.

**2.** Даведайцеся, якія дакументы неабходныя, каб вашай сям'і выдалі вялікую суму крэдытных грошай. З якой прычыны крэдыт могуць не даць?



Фінансавая азбука



**Авердрафт** – банкаўскі крэдыт, які даецца чалавеку на яго картку, каб тэрмінова за нешта расплаціцца.



Крэдыт прысеў у крэсла, закінуў нагу за нагу, падняў рукі ўгору:

– У-у, мой дарагі вучань, ведай: мяне спарадзілі лаціняне яшчэ ў старажытнасці, да нашай эры. Маё імя на лацінскай мове пішацца так: creditum. Гэтую мову добра ведалі ўсе вучоныя людзі, а сярод іх і беларусы: Францыск Скарына, Сымон Будны, Мікола Гусоўскі...



Янка адчуў, што чырванее. Яму зрабілася ніякавата, бо не ведаў амаль нічога пра гэтых знакамітых беларусаў. «Абавязкова распытаю ў бацькоў, у настаўніцы», – вырашыў Янка.

Грошыку было прыемна, што яго вучань такі ўважлівы, цікаўны. Перад Крэдытам, якога ён выклікаў, не сорамна. А старажытны дзядок пакрысе адкрываў свае тайны:

– Мяне ратавальнікам людзі празвалі... Ну, як эмэнэснікі. Яны заўсёды там, дзе бяда здараецца. Так і я – усюды там, у каго грошай мала...

Янка хіба не закашляўся:

– Вы што, можаце даваць грошы тым, у каго іх няма?

– Дык гэта ж мой галоўны клопат, – Крэдыт не хаваў сваёй задаволенасці: – Колькі жыву, столькі і падмагаю людзям.

– І мне зможаце даць грошай? – здзівіўся Янка.

– О, мой новы сябар, ведай: Крэдыт проста так грошай не раздае. Я пазычаю грошы. Даю ў доўг. З умовай, што яны вернуцца мне...





Крэдыт акінуў Янку праніклівым позіркам і спачувальна спытаў:

– Ну, і на што табе патрэбны грошы?

– Даўно мару пра квадрацыкл. А ў бацькоў усё грошай не стае.

– Вось што, Янка, твая мара – машына – можа быць у цябе праз некалькі дзён.

– Клёва! – мячыкам падскочыў Янка са свайго крэсла.

– Не спяшайся радавацца, – супакоіў яго Крэдыт. – Уважліва выслухай. Твой бацька ці маці мусяць прыйсці ў банк, аформіць пэўныя дакументы. Банк можа запатрабаваць заявы ад паручыцеляў.

– А гэта для чаго?

– А для таго, Яначка, каб перастрахавацца. Раптам твой бацька не зможа вярнуць доўг у дамоўлены час. Тады ўзятыя грошы банк запатрабуе з тых, хто паручаўся за твайго бацьку...

– Во як... – задумаўся Янка.



фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!

## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- Толькі пчала не пазычае, а з голаду памірае.
- Лепей галоднаму пераспаць, чым з доўгам прачнуцца.
- Доўг не грэе.

## Сакрэты ад Грошыка



**Калі з'явіліся крэдыторы і пазычальнікі**

Слова «крэдыт» упершыню сталі выкарыстоўваць старажытныя рымляне. У перакладзе з латыні «крэдытум» азначае «пазыка». Гісторыя ж узаемаадносінаў паміж крэдыторамі (людзьмі, якія даюць у доўг) і пазычальнікамі (людзьмі, якія бяруць у доўг) распачалася з часоў існавання першых сусветных цывілізацый у Месапатаміі і Егіпце. Грошай тады яшчэ не было, але многія сяляне пазычалі збожжа ў сваіх больш заможных суседзяў.



**Крэдыт** – гэта грошы, якія банк выдае кліентам у доўг. Праз пэўны час пазычаную суму трэба абавязкова вярнуць. Таксама давядзецца заплаціць банку дадатковую суму. Яна мае назву – працэнт па крэдыце. Крэдыты бываюць розных відаў. Напрыклад, мэтавыя – на пакупку кватэры, машыны. У гэтым выпадку банк адсочвае, куды трацяцца яго грошы. А спажывецкі крэдыт чалавек можа патраціць на звычайныя пакупкі.






Грошык ціха слухаў размову, якую ж сам і арганізаваў. І радаваўся. Яму заўсёды рабілася прыемна, калі Янка задумваўся.

– Дык гэта яшчэ не ўсё, што доўг трэба вярнуць, – спакойна тлумачыў Крэдыт. – Яго трэба вярнуць з дадатковай сумай. Яна называецца працэнт па крэдыце.

Дзядок заўважыў, што Янка не ўсё зразумеў, і цярпліва патлумачыў:

– Глядзі, кошт тваёй пакупкі банк падзеліць на дваццаць чатыры месяцы, калі доўг будзе аформлены на два гады. І вы будзеце патроху вяртаць узятыя грошы. Ты спакойна катаешся на сваёй машыне. Радуешся, весела бавіш час. Але за тэрміновыя паслугі трэба плаціць банку дадатковыя грошы. Вось і выбірай разам з бацькамі, як лепей паступіць.

Ці адразу купіць табе квадрацыкл і заплаціць даражэй?

Ці чакаць з пакупкай і пакрысе збіраць грошы на яе ў дамашняй скарбонцы?





## Фінансавая азбука



**Кліенты крэдытныя** – гэта і звычайныя людзі, і бізнесмены, і фірмы, і заводы, і сельскія гаспадаркі, і будаўнічыя арганізацыі. Адным словам, усе, хто пазычае ў банка грошы.

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!




Янка думаў. Грошык маўчаў. А Крэдыт прадаўжаў свой урок:

– Гэты від крэдыту, пра які я расказаў, называецца спажывецкі. За яго можна набыць што хочаш: тэлевізар, камп'ютар, халадзільнік, пуцёўку на адпачынак каля мора...

– А дом ці катэдж? – спытаў Янка.

– Гэта ўжо будзе мэтавы крэдыт. На вялікую суму. На дзесяць ці, можа, і дваццаць гадоў. – Крэдыт важна сядзеў у крэсле, і было відаць, што ён задаволены сабой, бо робіць добрую справу для людзей. – Я магу падмагчы купіць аўтамабіль, трактар – што хочаш. Але мае паслугі платныя.



## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся старажытнае слова, якое дало імя герою гэтай казкі.





– А што вы, дзядуля Крэдыт, купляеце за сваю зарплату? – спытаў Янка.

– Хэ, – бадзёра хмыкнуў Крэдыт. – Я служу банку. Мае заробкі ідуць на тое, каб выплаціць, напрыклад, нашым укладчыкам працэнты па ўкладах. У цябе ёсць уклад у банку?



– Ёсць, – ціха сказаў Янка і зірнуў на Грошыка, нібы пытаючыся, ці не прагаварыўся, бо ўклад – гэта банкаўская тайна.

– Вось і добра, што маеш свой уклад, – пахваліў Крэдыт. – Я зараблю грошай, і твой уклад падрасце. Так вось грошы ходзяць з рук у рукі. І памагаюць людзям жыць...

Крэдыт крактануў на развітанне. Знік гэтак жа нечакана, як і з'явіўся. А Грошык з Янкам вырашылі схадзіць на экскурсію ў банкаўскі музей.



## Сакрэты ад Грошыка

**Як скарыстаўся крэдытам Францыск Скарына?**

Беларускі першадрукар Францыск Скарына распачаў сваю выдавецкую дзейнасць у сталіцы Чэхіі – горадзе Празе. Ён марыў выпускаць кнігі на сваёй Радзіме – у Вялікім Княстве Літоўскім. Але 500 гадоў таму на нашых землях не было яшчэ ніводнай друкарні. Тады славуты беларускі асветнік узяў крэдыт у магістрата сталіцы Княства – горада Вільні і на гэтыя грошы заснаваў першую ў краіне друкарню, дзе ён выдаваў кнігі на нашай роднай мове.





фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!

# 7. ДЗІВА-МУЗЕЙ

Грошык вёў Янку ў музей грошай. Вядома ж, не толькі грошай, а ўсяе грашовай спадчыны, гісторыі нашай краіны.

На праспекце, дзе знаходзіцца банк, шматлюдна. І Грошык раптам стаў невідзімкам.

– Не хачу, каб на нас звярталі ўвагу, – патлумачыў Янку.

– А чаго палохаешся?

– Ды я не з палахлівых, – пачаў апраўдвацца Грошык. – Але ж зразумей: людзі ніколі не носяць кашалькі ў руках і раскрытымі. Правільна?

– Ага, навошта паказваць...

– Во, бачыш, як усе аберагаюць грошы. Трымаюць іх у сакрэтных хованках. Вось і я схаваўся. Ці мала што...



Неўпрыкмет Грошык і Янка прыйшлі да банка. Але незаўважанымі трапіць у яго музей ім не давялося. Янку спыніла варта і папрасіла прад'явіць пропуск. Грошык хуценька націснуў патрэбную кнопачку на кошыку і адразу з невідзімкі стаў відзімкам у поўнай сваёй красе.



## Фінансавая азбука



**Золата** – высакародны каштоўны метал. Золата выконвае ролю грошай з далёкай мінуўшчыны. Па яго дзяржаўных запасах мяркуюць пра багацце той ці іншай краіны. Золата захоўваецца і прадаецца ў злітках, манетах.



## Сакрэты ад Грошыка

Сучасная бронекамізэлька інкасатара важыць усяго 3–4 кілаграмы, сумка інкасатара – да 7 кілаграмаў, мяшок – да 40 кілаграмаў.

– О, сам Грошык да нас! – дзяжурны ледзь не ўзяў пад казырок.

– Ага, хачу свайму Янку паказаць банкаўскі музей.

– Дык праходзьце сюды, налева, – паважліва ўсміхнуўся вартаўнік.

У пакоях, адведзеных пад музей, ужо тоўпіліся людзі. З імі гутарыў экскурсавод – знаўца грашовага лёсу на Беларусі.

Янка наважыўся слухаць яго, але Грошык штурхнуў сябра пад бок:

– Я – твой гід!.. Вушы натапыр на мой голас...

Грошык падвёў Янку да стэнда з дзіўнымі рэчамі:

– Гэта даўняя падліковая машына.

Што ўбачыў Янка? Драўляная рамка, а ў ёй – на жалезных дроціках насаджаны драўляныя круглячкі. Гэта і быў бухгалтарскі лічыльнік.

– На ім можна складваць, аднімаць да тысячы? – здзівіўся Янка.

– Лёгка!.. Нават да мільёнаў!.. Можна падлічыць і дробныя грошы, – гаварыў-хваліўся Грошык. – Потым драўляны лічыльнік замяніў металічны арыфмометр «Фелікс». З яго дапамогай служачыя банка хутка множылі, дзялілі, складвалі і аднімалі любыя лікі...



## Школка Грошыка

**1.** Ці ёсць у вашай сям'і манетніца-скарбніца? Якія самыя старажытныя грошы вам пашчасціла бачыць, мець, трымаць у руках?

**2.** Як называецца навука, якая вывучае старажытныя манеты і медалі? А як называецца чалавек – аматар збіраць грошы розных краін і самых розных часоў?



Янка не мог адвесці вачэй ад старых лічыльнікаў, якія адпачывалі ў музеі.

– Яны, як мой дзядуля, на пенсіі цяпер, – прамовіў Янка.

– Ты правільна думаеш, – пахваліў сябра Грошык. – Музей для таго і зрабілі, каб людзі ведалі, што было, і цанілі, што ёсць.

Грошык парадаваўся за свайго вучня, бо адчуваў, што музей выклікае яго на роздум. І гэта надавала гіду імпэту.



Такую сувенірную купюру выдае банкамат у музеі

– А вось скажы, Янка, чаму сярод экспанатаў – партрэт твайго цёзкі Янкі Купалы і яго кніга «Спадчына»?

– Не ведаю, – шчыра прызнаўся Янка.

– А таму, мой сябра, што паэт Янка Купала быў першым укладчыкам у першай ашчаднай касе Мінска. Свой ганарар за кнігу «Спадчына» ён паклаў на ашчадную кніжку пад нумарам адзін. І было гэта ў далёкім 1923 годзе...



Яны падышлі да новага стэнда. Янка ахнуў ад здзіўлення:

– На грашах – вайна!

– Гэта, Янка, не зусім грошы, а грашовыя аблігацыі. У вайну людзі аддавалі свае зберажэнні на патрэбы абароны. Бачыш, на білетах намаляваны танкі, самалёты, якія ідуць у бой. Яны зроблены на грошы людзей-патрыётаў...

– Выходзіць, і грошы майго прадзеда ваявалі, – прамовіў Янка.

## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі і выслоўі?

- За морам цялушка-палушка, ды руб перавозу.
- За свае грошы ўсюды харошы.
- Адплаціць той жа манетай.
- Прымаць усё за чыстую манету.





**Інкасатар** – банкаўскі служачы, які забяспечвае прывоз наяўных грошай на спецмашыне ў грошасховішча банка з магазінаў, пошты, кіёскаў. Інкасатары апрануты ў спецформу, маюць пры сабе зброю.

Задаволены Грошык падвёў свайго слухача да новых экспанатаў:

– Глядзі, тут сабраны старыя ашчадныя кніжкі. Раней іх выдавалі сваім кліентам ашчадныя касы.

Янка ўражаны: на вокладках першых ашчадных кніжак намаляваны пелікан.

– Слухай, Грошык, а чаму такая павага да гэтай птушкі? – спытаў Янка. – Мо таму, што яны пад доўгай дзюбай вялікі мяшок носяць, як кашалёк?

– І гэта ўлічвалі мастакі, – пагадзіўся Грошык, але даў сваё тлумачэнне. – Ведаеш, водная птушка пелікан праяўляе выключную любоў да сваёй сям'і. Існуе легенда, як пелікан разарваў свае грудзі, каб выратаваць уласнай крывёю родных дзетак.

– Выходзіць, і банкаўскія работнікі – дабрадзеі для людзей, – задумліва сказаў Янка.

Далей ішлі стэнды, на якіх можна было ўбачыць грошы розных часоў. Янка дзівіўся з вялізных купюр, на якіх «сядзела» сама імператрыца Кацярына. Існавалі нават папяровыя капейкі. Але найбольш прываблівалі Янку металічныя манеты. А сярод іх – срэбныя, сувенірныя, прысвечаныя розным падзеям.





## Сакрэты ад Грошыка



Тройская унцыя золата (ад англійскага troy ounce) – гэта адзінка вагі, роўная 31,1034768 грама, але часта яна акругляецца да 31,1035 грама. Выкарыстоўваецца ў банкаўскай і ювелірнай справе.

## Фінансавая азбука



**Манета** – грашовы металічны знак. Ён можа быць з золата, срэбра, медзі, нікелю, іншых металаў. Манета мае пэўную вартасць і адметныя дзяржаўныя адзнакі. Чаканяць такія грошы на спецыяльных станках.

**Манеты памятныя** – манеты, якія выпускаюць да пэўных дат, падзей, напрыклад да юбілеяў грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, вучоных, мастакоў.



– Глядзі, на манеце лагатып нашага банка, – не стрымаўся, выгукнуў Янка на ўвесь музей.

– Банк адзначаў свой юбілей, – патлумачыў Грошык, – і выпусціў манету ў знак гэтай падзеі. Літара «Б» выканана ў форме квадрата з чатырох белых стужачак. Яны і даюць адчуванне прасторы, росту, перспектывы.





На іншых манетах Янку спадабаліся выявы балерыны, зубра, савы, Францыска Скарыны, Еўфрасінні Полацкай, спартыўнага будынка «Мінск-Арэна».

Асобным дзівам сталіся «жывыя» манекены. Па іх можна меркаваць, у якім адзенні хадзілі даўнейшыя фінансавыя служачыя, як апранаюцца цяпер. Янка доўга не хацеў адыходзіць ад «ахоўнікаў» сучаснага банкамата. Яны ў лёгкай спецыяльнай форме, з аўтаматамі, з мяхамі «грошай». Гэта інкасатары. Яны развозяць грошы па банкаматах, збіраюць выручку па гандлёвых пунктах.

Служба вельмі адказная.

# Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся назву знака, які выяўляе сутнасць пэўнай арганізацыі.

в = г



а = ы ,,



,,,



## Сакрэты ад Грошыка



Першыя ў свеце манеты з'явіліся ў 7 стагоддзі да нашай эры ў Лідзіі. Гэтая дзяржава знаходзілася ў Малой Азіі. Лідзійцы выраблялі манеты з кавалкаў натуральнага сплаву золата і срэбра, сабраных у горных ручаях. Спачатку гэтыя кавалкі награвалі над агнём да змякчэння, а потым выкладвалі на пласціну і апрацоўвалі молатам. На адным баку манеты чаканілі выяву львінай галавы, а на другім — два прамавугольнікі.



І ўжо зусім здзівіўся Янка, калі Грошык правёў яго ў спартыўны пакой. Тут дэманструюцца кубкі, дыпломы, дасягненні банкаўскіх спартсменаў. Ёсць нават форма сапраўдных хакеістаў. На зялёна-белых майках – лагатып з арыгінальнай літарай «Б». А на вялікім фота – супрацоўнік банка, які браў удзел у эстафеце нясення алімпійскага агню ў Канадзе.





Янка выходзіў з музея грошай ашаломлены, узрушаны, здзіўлены. І адразу падступіўся з просьбай да Грошыка прывесці сюды сваіх аднакласнікаў.

### Фінансавая азбука



**Нумізматыка** – вывучэнне па манетах гісторыі грашовых сістэм, абарачэння грошай, тэхнікі вырабу манет. Нумізматы калекцыянуюць і даследуюць рэдкія, старажытныя манеты, манетныя скарбы, папяровыя грошы. Вялікая калекцыя манет захоўваецца ў Дзяржаўным гістарычным музеі Беларусі.



# 8. КУРС – ДАРОГА РУБЛЯ



Янку карцела дазнацца ў Грошыка: няўжо і праўда за грошы можна купіць усё на свеце? Грошык, мудры і далікатны грамацей, не захацеў навязваць Янку свае веды. Ён адшукаў на камбінезончыку патрэбную кнопку, націснуў на яе і прашаптаў замову:

*Трын-тры-тра-ля-ля,*
*Дайце Янку рубля.*
*Не з паперы, не з металу,*
*А з жывога капіталу.*

І што вы думаеце: тут жа аб'явіўся франт у новенькім касцюмчыку. Тонкі, падцягнуты, насаты, як адзінка. А на галаве – прычоска ўся ў нулях. Вочы, нос, рот, вушы таксама падобныя на нулі. І ён гэтак інтэлігентна звярнуўся да Грошыка:



– Выклікалі?.. Чым магу служыць?..

– Вось мой сябар Янка хоча ведаць, дзе і што вы можаце раздабыць за свой кошт.

– О сябар Янка, я валюта хадавая, вельмі патрэбная. У Беларусі на грашова-фінансавай прасторы я, Рубель, поўны гаспадар. Магу купіць усё: ад самазвала-велікана да салодзенькай жуйкі...

## Фінансавая азбука



**Еўра** – грошы Еўрапейскага саюза, які аб'ядноўвае амаль усе краіны Еўропы. Адна з самых «маладых» валют, бо сам Еўрасаюз утварыўся не так даўно.





# Сакрэты ад Грошыка

Юань – так называюцца грошы Кітая. Гэтая краіна – радзіма папяровых грошай. Яны з'явіліся яшчэ ў 910 годзе да нашай эры. Тады людзі не вельмі давяралі такім грашам. Разлічваліся, як звычайна, манетамі, дарагім металам. Кітайскі імператар выдаў указ: караць тых, хто не хоча гандляваць за папяровыя грошы. Цяпер юань – шырока вядомая і важная валюта ў свеце.

– І самалёт можаце набыць, і «пежо»? – спытаўся Янка.

– Крыўдзіш, сябар! Я такое магу, што табе і не снілася.

– Дык купі мне амерыканскіх долараў. Я злятаю ў іхні Дыснейленд.

– Пайшлі ў абменны пункт, – жыва прапанаваў Рубель.

Па дарозе грашовы гаспадар павучыў Янку:

– Запомні адно правіла: грошы любяць разумных людзей. Вучыся быць такім!

– Я стараюся, – пагадзіўся Янка.

– Ведай, мой новы сябар Янка, у кожнай краіне валадарыць свая валюта. Гэта слова прыдумалі некалі італьянцы. Яно на іх мове азначае «кошт». Зараз мы з табой будзем купляць долары.





# Школка Грошыка

**1.** Якой валютай карыстаюцца насельнікі нашых краін-суседак – Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Латвіі?

**2.** Паглядзіце на карту Еўропы і пералічыце краіны гэтага кантынента. У якіх з іх еўра – асноўная валюта?

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню
з упэўненасцю!



**Валюта** (ад лацінскага valeo – «каштую») – грашовыя адзінкі, якія маюць свой кошт.

– Выходзіць, адны грошы могуць купіць другія грошы.

– Так, мой сябар, усё на свеце купляецца і прадаецца, – дзелавіта адказаў Рубель і пачаў разглядаць аб'яву, якая вісела ў абменным пункце. – О, сёння долар патаннеў! Учора за яго трэба было плаціць болей рублёў.

– А чаму так? – не пераставаў здзіўляцца Янка.

– Кошт валюты, мой сябар, залежыць ад попыту на яе. Калі ўсе людзі кінуцца купляць, напрыклад, еўра, то яго кошт тут жа падскочыць.

– Што, сам сабой? Сам возьме і падскочыць?



– Ды не, у кожнай краіне кошт розных валют устанаўлівае самы галоўны банк. У Беларусі гэта Нацыянальны банк, які размяшчаецца ў цэнтры сталіцы, у Мінску. Іх цэннік з'яўляецца арыенцірам для ўсіх банкіраў, для самых розных банкаў, якія абслугоўваюць людзей. Хоць...





## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- Сквапнаму рубель даражэйшы за душу.
- Усіх грошай на свеце не збярэш.
- Грош гроша шукае.
- Без нуды пражывеш, калі грошай нажывеш.

Тут Рубель загадкава зірнуў на Янку, хітравата ўхмыльнуўся:

– Ведай, мой сябар, кожны банк мае права рэгуляваць кошт валют. Зноў жа з улікам таго, як яго кліенты купляюць замежныя грошы. Але арыенцірам для ўсіх, паўтараю, з'яўляецца курс, устаноўлены галоўным банкам...

Рубель і Янка пагадзіліся не бегаць па абменніках і банках, не шукаць таннейшага долара. Ім быў цікавы сам працэс.

Калі яны падышлі да акенца, за якім сядзела супрацоўніца банка ў белай кофтачцы з зялёным шалікам, Рубель дзелавіта прамовіў:

– Прадайце нам долараў.

Праз якую хвіліну Рубель трымаў у руках зялёныя грошы. На іх – партрэты замежных людзей, незнаёмыя будынкі, па-англійску ўсе надпісы. І толькі па лічбах Янка адрозніваў купюры – 5, 10, 20, 50, 100 долараў.











## Сакрэты ад Грошыка

**Адкуль паходзіць назва нашай нацыянальнай валюты?**

У старажытныя часы на Русі адным з галоўных плацежных сродкаў былі грыўны – доўгія срэбныя злiткі. Паколькі манет тады не хапала, на кірмашах узнікала праблема, чым даць рэшту. Гандляры вырашалі гэтую праблему вельмі проста: яны рубілі грыўны на дзве часткі. Такі кавалак срэбра і атрымаў назву — «рубель».

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню
з упэўненасцю!

– З гэтай валютай, – патлумачыў Рубель, – ты можаш пабываць не толькі ў Злучаных Штатах Амерыкі, але і ў любой краіне, бо долар – значная валюта свету.

– Ва ўсім свеце? На ўсёй Зямлі? – перапытаў Янка.

– Так, мой сябар, долар ахвотна памяняюць англічане на сваю валюту – фунт стэрлінгаў, кітайцы – на юань, японцы – на іену, в'етнамцы – на донг...

На развітанне Рубель сказаў Янку:

– Жадаю табе цікавай замежнай вандроўкі!

## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся, чаго нельга купіць за грошы.




## Красворд




**1.** Грашовая адзінка В'етнама.
**2.** Грошы еўрапейскіх краін.
**3.** Грошы, якімі карыстаюцца ў Польшчы.
**4.** Валюта, якая раней, да ўступлення ў Еўрасаюз, была ў Аўстрыі.



**Эмісія** (ад лацінскага emissio – «выпуск») – выпуск банкнот, папяровых грошай і каштоўных папер. У Беларусі выпускаць банкноты мае права Нацыянальны банк.

Рубель як з'явіўся, так і знік нечакана. Увесь час ім кіраваў мудры Грошык са сваім таямнічым кошыкам. Янку, які яшчэ быў у палоне новых думак, Грошык задаў нечаканае пытанне:

– А ты верыш, што за грошы, як тут хваліўся Рубель, можна купіць усё-ўсё?

– Ён так казаў.

– Правільна, можна набыць за грошы машыну і каня, катэдж і кватэру, камп'ютар і цукеркі, – трошкі гарачыўся Грошык. – А ты, Янка, падумай, ці можна купіць за грошы сяброўства, каханне, здароўе?

Янка задумаўся.



## Сакрэты ад Грошыка



**Дзе абарочваецца еўра**

У наш час 28 еўрапейскіх краін аб'яднаны ў Еўрасаюз, гэта значыць межы паміж імі адкрытыя і ўсе мытні скасаваныя. У большасці такіх краін афіцыйнай валютай з'яўляецца еўра. Ён быў уведзены ў еўрапейскіх дзяржавах у 1999 годзе. Графічны знак еўра – «€». Гэта камбінацыя лацінскай літары «Е», якая абазначае Еўропу, грэчаскай літары «эпсілон» («Ɛ»), якая падкрэслівае значнасць валюты, і дзвюх паралельных рысак, што перасякаюць знак і сімвалізуюць стабільнасць.

# 9. СЛУГА І ДАБРАХОТ



Як толькі закончыліся летнія канікулы, Грошык тут жа аб'явіўся перад Янкам, засыпаў яго пытаннямі:

– Ну, дзе пабываў за лета?.. Што бачыў?.. Што адкрыў для сябе?.. Чым здзівіўся?..

– Мілы Грошык, не паверыш: я на ліфце пад зямлёю катаўся.

– Няўжо ў шахту спускаўся?

– Ага! Там цэлы саляны горад. Па тунэлях машыны ездзяць. Даўжэзныя транспарцёры вывозяць калійную соль. Лізнуў бела-чырвоную сцяну – салёная!..

Грошык радаваўся. Яму хацелася сказаць Янку нешта вельмі важнае, але ён маўчаў. Хай спавядаецца сябар.

– Там, пад зямлёй, працуюць шахцёры. Там нават санаторый ёсць. Дзеці лечацца ў салёных пячорах. А над зямлёй – вялізны горад. Называецца – Салігорск...

фінансавая • ГРАМАТНАСЦЬ • фінансавая
БЕЛАРУСБАНК
У будучыню з упэўненасцю!



## Фінансавая азбука



**Бізнес** – такая дзейнасць чалавека, якая прыносіць грашовы прыбытак.

**Інвестар** – чалавек ці арганізацыя, якія маюць капітал (шмат грошай) і могуць укласці свае здабыткі ў прамысловасць, будаўніцтва дамоў, дарог, іншыя аб'екты для атрымання прыбытку. Бываюць інвестыцыі дзяржаўныя, прыватныя, унутраныя, замежныя.

## Сакрэты ад Грошыка

У Сярэднявеччы папулярнай была арэнда рыцарскіх даспехаў. Яны каштавалі вельмі дорага, сума арэндных плацяжоў магла складаць да 25 % ад продажнага кошту даспехаў.



Грошык усё-ткі перахапіў размову, падкінуў сваю таямніцу:

– Ведай, Янка: у тым горадзе працуюць верныя слугі нашага банка.

– Хто яны? Я іх там не бачыў.

– Ды з імі ты знаёмы. Гэта – Рубель і Крэдыт.



– І каму ж яны слугуюць?

– Усім дабрахотам!..

– Дабрахотам? – перапытаў Янка, бо першы раз чуў пра такіх уладароў.

– Так мы называем тых, хто пазычае грошы ў банка на свае патрэбы. Гэта тыя кліенты, якія добраахвотна бяруць рублі ў крэдыт.

– Дык колькі ж рублёў трэба ўзяць, каб шахцёры працавалі, каб іх горад жыў? – задаў пытанне Янка і сам адказаў: – Мо поўны вагон грошай?

– Можа, і не адзін вагон, – таямніча лыпнуў вачыма Грошык. – Такога багатага дабрахота банк называе кліентам першага класа.

– І што, шмат у вас гэткіх «першакласнікаў»?

– Хапае! – махнуў рукой Грошык. – Лічы, усе самыя буйныя прадпрыемствы Беларусі – трактарны і аўтамабільны заводы, «Беларуськалій», Беларуская чыгунка...



## Школка Грошыка

**1.** Хто можа ўзяць вялікія крэдыты ў банку? Пад якія дзяржаўныя праграмы?

**2.** Якая роля банкаўскіх крэдытаў у эканоміцы краіны?

**3.** Хто такі інвестар? У што ён можа ўкладваць свае грошы: у бізнес, развіццё навукі, будаўніцтва дома ці ў пакупку завода, зямлі?



## Сакрэты ад Грошыка

Старажытныя фінікійцы здавалі ў арэнду свае марскія судны, прапаноўваючы ўласныя карабельныя каманды ў якасці дадатковай паслугі.

Грошык усё болей паддаваў жару ў цікавую размову:

– У банка ёсць яшчэ кліенты другога класа – малочныя заводы, мясакамбінаты... Віп-кліенты ёсць – важныя і патрэбныя ў краіне ўніверсітэты, інстытуты, міністэрствы... Усім патрэбны Рубель, каб дапамагаў жыць, развівацца, служыць эканоміцы дзяржавы, дабрабыту людзей...



– Дык што, банк такі добранькі, раздасць усе грошы дабрахотам і стане пустым? – здзівіўся Янка.

– Ты што!.. А крэдыт навошта?.. Без яго нікому грошай проста так не даюць.

– Узятую суму трэба вярнуць? – здагадаўся Янка.

– Абавязкова!.. Ды яшчэ і з наварам, які называецца працэнтамі...



## Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- Ляжачыя і грошы ржавеюць.
- Калі маеш грошы, то не будзеш босы.
- Грошы ў доўг дае, ды не за так, а хто не бядак.

## Фінансавая азбука



**Лізінг** – спосаб набыцця дарагіх рэчаў. Іншымі словамі – фінансавая арэнда. Лізінгавая кампанія набывае тое, што вам патрэбна, і аддае ў карыстанне, а вы паступова вяртаеце ёй грошы. Значыць, выплачваеце лізінгавай кампаніі кошт набытай рэчы і плату за карыстанне. А калі ўся сума будзе выплачана, то рэч становіцца вашай.

– І гэта выгадна дабрахотам?

– Яшчэ як! Крэдыты банка яны ўкладваюць у сваю вытворчасць. Купляюць тэхніку. Зарабляюць новыя грошы. Разлічацца з пазыкай. Выдадуць людзям зарплаты, прэміі, пабудуюць для рабочых новыя дамы, для дзяцей – школы, стадыёны. А калі вольныя грошы з'явяцца, пакладуць іх у банк...



– Дык што выходзіць? – здзівіўся Янка. – Грошы круцяцца вакол банка, як Зямля вакол Сонца.

– Правільна, у грошай як бы свае поры года: ёсць зіма з праблемамі, ёсць вясна з надзеяй, ёсць лета з верай і ёсць восень з грашовым ураджаем.

– Як жа здорава, Грошык, што ты ўсё ведаеш пра грошы! – пахваліў Янка свайго мудрага сябра.

## Школка Грошыка



Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся, як называецца самы галоўны банк Беларусі.

**ра = цы** **кар = наль** **ага = ы** **ан = к**



## Сакрэты ад Грошыка



Белы дом быў аддадзены ў лізінг амерыканскаму фермеру на 99 гадоў усяго за 100 тысяч долараў у год. Гэты факт меў месца ў 1925 годзе. Фермер вялікага тэхаскага ранча буйной рагатай жывёлы адразу пасля заключэння здзелкі аддаў 100 тысяч долараў за першы год арэнды з правам выкупу рэзідэнцыі амерыканскіх прэзідэнтаў.

# 10. КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ

На гэты раз Грошык задаў вельмі просценькае пытанне:
– Скажы, Янка, што такое каштоўныя паперы?

– Грошы! – хмыкнуў Янка і патлумачыў, як выдатнік Школкі Грошыка. – Глядзі, грошы друкуюцца на паперы. Вось гэтая папера і становіцца вельмі каштоўнай. За яе можна купіць што хочаш.

Грошык задаволены сваім вучнем. Але тут жа задае новае пытанне:

– А яшчэ якія паперы маюць вялікі кошт?

Янка называў кнігі пісьменнікаў і падручнікі, Біблію і карціны мастакоў на паперы, кардоне. Ён нават прыгадаў, што даўным-даўно пісалі пісьмы на бяросце. Яна служыла паперай і была вельмі каштоўнай.



## Школка Грошыка

**1.** Ці можна прадаць свае акцыі іншаму акцыянеру? У якіх выпадках гэта робіцца?

**2.** Для чаго трэба ведаць сэнс такіх слоў, як «даход», «дэпазіт», «дэпазітарый», «дывідэнды»? Ці складаныя яны для вас?



**Аблігацыя** – від каштоўных папер, якія можна купіць у банку. Гэта своеасаблівы від зберажэнняў. Праз нейкі час, скажам, праз год, прыносіце аблігацыі ў банк і атрымліваеце свае грошы назад, прычым з працэнтамі.



Грошык задаволена цешыўся, што Янка назваў столькі відаў каштоўных папер. Пахваліў сябра за старанне ў ведах. Ды не прамінуў папправіць яго:

– Меркаванні твае, Янка, добрыя, але ж мы з табой вывучаем фінансавую грамату. Якія могуць быць, апрача грошай, каштоўныя паперы?

Янка прыкметна заморгаў вачыма, крыху нават пачырванеў і прызнаўся:

– Здаюся...

Грошык гэтага і чакаў. Ён, як Калабок, пракаціўся туды-сюды ад задавальнення, прыпыніўся, ускочыў на табурэт, пераможна ўзняў угору рукі і абвясціў:

– Акцыя!

– А што ты надумаўся прадаваць? – тут жа зацікавіўся Янка. – Мы з мамай хадзілі нядаўна ў «Еўраопт», і там была акцыя «Купляйце бананы па зніжанай цане».

– Не, дружа, тое, што ты бачыў у магазіне, гэта прыём гандляроў – прадаць хутчэй тавар, – патлумачыў Грошык. – А я маю на ўвазе акцыі як каштоўныя паперы, за якія можна купіць нават частку завода.





## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся назву каштоўнай паперы.

’ 2 = а



’’’ 3 = а ’’’



1, 2, 6



## Фінансавая азбука



**Акцыя** – від каштоўных папер. Яна можа каштаваць частку завода, фабрыкі, фірмы. Чалавек, які мае такія паперы, называецца акцыянер. Акцыянеры згуртоўваюцца ў акцыянернае таварыства і маюць права ўдзельнічаць у кіраванні заводам, фабрыкай, фірмай. Прыбытак ад вытворчасці дзеліцца паміж акцыянерамі. Чым больш акцый у чалавека, тым большы яго прыбытак.





– Ага, тады я набуду крэсла дырэктара і буду кіраваць усімі.

– Не зусім так, – прыпыніў сябра Грошык. – Глядзі, нехта захацеў стварыць цацачную фабрыку. Але ў яго не стае грошай, каб купіць патрэбнае абсталяванне, адрамантаваць будынак ці збудаваць новы будынак. Тады ён вырашае запрасіць іншых людзей паўдзельнічаць у бізнесе. Ствараецца акцыянернае таварыства. Яно выпускае акцыі. Усе, хто купіў акцыі, становяцца акцыянерамі фабрыкі.

– Яны што, аддалі грошы фабрыцы, а ім якая выгада? – здзівіўся Янка.

– Вось ты і трапіў на мой кручок, – задаволена ўсміхнуўся Грошык. – Натуральна, рызыка ў акцыянераў ёсць. Але ж яны са сваім укладам становяцца ўдзельнікамі кіравання фабрыкай. І калі справы наладзяцца, усе ўладальнікі акцый атрымаюць прыбытак. На мове фінансавай гэта і ёсць дывідэнды.

– Ух ты, колькі будзе грошай! – парадаваўся Янка, як бы ў яго кішэні ўжо ляжалі акцыі цацачнай фабрыкі.

– Пачакай радавацца, – спыніў яго Грошык. – Безумоўна, акцыі больш даходныя, чым звычайныя грашовыя ўклады. Але ж акцыянеры і рызыкуюць. А раптам фабрыка не будзе мець даходаў?

### Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- Прамяняў бы́ка на інды́ка.
- Дарага – міла, а танна – гніла.
- Купіў бы сяло, ды грошай гало.
- Хто грошай не мае, той спакойна спіць.



Янка задумаўся. А Грошык працягваў урок:

– Акцыі прадаюцца на біржы. Там можна пакарыстацца паслугамі спецыялістаў, якіх называюць брокерамі. Яны дапамогуць выбраць выгадныя, надзейныя акцыі.

– Слухай, Грошык, а што можна рабіць з дывідэндамі, якія выплаціць фабрыка?

– Хэ, што хочаш!.. Гэта тыя ж грошы. За іх можна набыць новыя акцыі ці патрэбную рэч. Твой даход – ты і думай, як яго патраціць.

– Цяпер я зразумеў, – сказаў Янка. – Вольныя грошы не павінны залежвацца. Яны мусяць працаваць, зарабляць новыя грошы.

– За такую выснову стаўлю табе дзясятку! – аб'явіў Грошык. – А дамашняе заданне будзе такое: падумай і адкажы, якія яшчэ існуюць фінансавыя каштоўныя паперы? Іх, дарэчы, можна купіць у банку. Яны таксама, як уклады і акцыі, зберагаюць грошы і прыносяць прыбытак. Гэтыя каштоўныя паперы можна нават падарыць каму хочаш. І той, хто іх мае, атрымлівае ў банку грошы. Даю дзве падказкі. Першая: гэтыя каштоўныя паперы прыдумалі даўным-даўно. Другая: яны сапраўдныя толькі на пэўны час.



**Біржа** – спецыяльная юрыдычная арганізацыя. Ёсць біржы таварныя, фондавыя, валютныя. Фондавая біржа, напрыклад, дае магчымасць гандляваць каштоўнымі паперамі праз электронную тэхніку. Спецыяльны чалавек, які мае права ўвайсці ў электронную гандлёвую сістэму біржы і працаваць у інтарэсах пакупніка, называецца брокерам.





**Даход** – грашовы прыбытак.
Слова «даход» можна разумець так: даходзіць да некага, прыходзіць, хадзіць. Прынёс тата дадому зарплату. Дайшлі грошы да сям'і. Ёсць даход! Такі грашовы прыбытак могуць складаць і маміна зарплата, і бабуліна пенсія, і прададзеныя дачная агародніна ці лішнія хатнія рэчы. Выйгрыш па латарэі – таксама даход.






Янка ўважліва слухаў, відаць, зразумеў, што заданне няпростае, і тут жа прапанаваў:

– А можна зрабіць званок сябру?

– Вядома ж! – пагадзіўся Грошык. – Ты можаш нават абмеркаваць гэтае заданне з татам, мамай, настаўнікам. Уключай навігатар мозга!..





**Дэпазіт** – грошы або каштоўныя паперы, якія ўносяцца, напрыклад, у банк. Калі вольныя грошы з сямейнага бюджэту пакласці на захаванне ў банк, то яны стануць дэпазітам.

**Дывідэнды** – гэта таксама даход, але не ад чыстых грошай, а ад каштоўных папер – акцый.

# Сакрэты ад Грошыка



**Дзе з'явіліся першыя акцыі?**

Першымі ў свеце каштоўнымі паперамі ў выглядзе акцый пачалі гандляваць у 17 стагоддзі ў сталіцы Нідэрландаў – горадзе Амстэрдаме. Гэтыя паперы выпусціла адна з самых буйных на той час міжнародных камерцыйных арганізацый – Ост-Індская гандлёвая кампанія. Чалавек, які набываў такую акцыю (акцыянер), меў магчымасць атрымліваць пэўную частку грошай з прыбытку кампаніі.







# 11. СПАГАДЛІВЫ СТРАХ

– Сёння, Яначка, я пазнаёмлю цябе з дзядзькам Страхам, – загадкава падміргнуў Грошык.

Янка ўжо даўно ведае, што Грошык гатовы рабіць любыя сюрпрызы. Але каб сустракацца з самім Страхам, такога і ворагу не пажадаеш, не тое што сябру.



– Чаму замаркоціўся? – Грошык весела пімкнуў Янку па дзюбцы носа.

– Страх мяне бярэ ад сустрэчы са Страхам.

– А чаму ты баішся яго?

– Ага, ён аднойчы напусціў на мяне пчол, і яны пакусалі мяне… Ён з неба грыміць, калі навальніца… Страх у лесе жыве, заманьвае людзей у балота…

– Бачу, ты ведаеш Страха, у якога вочы вялікія, – супакоіў Грошык сябра. – А мой дзядзька Страх – добры і спагадлівы. Ён вельмі патрэбны чалавеку.

– Патрэбны? – здзівіўся Янка і даверліва зірнуў на мудрага Грошыка.

## Школка Грошыка

**1.** Якія віды страхавання, абавязковыя і добраахвотныя, вы ведаеце?

**2.** Вы едзеце адпачываць у Італію. Чаму без медыцынскай страхоўкі вы не зможаце выехаць у паездку?



Грошык і Янка зайшлі ў будынак, на якім вісела шыльда «Страх і кампанія».

І тут жа да іх падышоў ветлівы дзядзька, у акулярах, пры гальштуку. Прыпадняў з галавы саламяны капялюш, усміхнуўся і сказаў:

– Што пажадаеце, маладыя людзі?

– Мы-ы... – хацеў тлумачыць Грошык, а пасля паправіўся: – Я прашу вас, спагадлівы Страх, патлумачыць майму сябру Янку, як можна палегчыць страшныя страхі, якія паўсюль падпільноўваюць людзей.




Страх запрасіў Янку і Грошыка за столік, прапанаваў ім бярозавага соку. Сам прысеў і для пачатку размовы спытаўся ў хлопчыка:

– У вашай сям'і, малады чалавек, ёсць аўтамабіль?

– «Фальксваген»! – з гонарам адказаў Янка. – Мне тата даваў паруліць...



## Школка Грошыка



Як вы разумееце прымаўкі?

- Чалавек грошы збірае, а чорт мяшок шые.
- Збірай і збірай грошы, а чорт на іх дзірку знойдзе.
- Усе ліпкі да прыбыткі.
- Прыйдзе каза да майго воза сена прасіць.

**Страхаванне** – фінансавая паслуга, своеасаблівая абарона ад усялякай рызыкі – крадзяжоў, няшчасных выпадкаў, аварый. Страхаванне бывае абавязковым і добраахвотным. Усе вадзіцелі павінны мець страхоўку машыны. Абавязкова трэба купляць страхоўку тым, хто едзе за мяжу. А добраахвотнае страхаванне кожны чалавек выбірае сам. Напрыклад, можна застрахаваць дом, кватэру, дачу і нават мабільны тэлефон. Калі што з імі здарыцца, то страхавая кампанія аплаціць расходы, напрыклад, на рамонт.



– А ты, малады чалавек, калі-небудзь бачыў дарожныя аварыі?
– Ага, мы ехалі, а на шашы стаялі дзве разбітыя машыны. І даішнікі нешта мералі стужкай і фоткалі...
– Дык вось, малады чалавек, наша страхкампанія праводзіць абавязковае страхаванне ўсіх аўто. Праца вялізная. Таму нам дапамагае банк.
– А што такое страхаванне? – перапытаў Янка.
Страх задаволена зірнуў на юнага кліента. Яму спадабалася яго зацікаўленасць, і ён пачаў тлумачыць:
– Мы, безумоўна, не можам засцерагчы шафёраў ад аварый. Але палегчыць трагедыю – наш клопат.
– Як гэта? – Янка ажно падскочыў з крэсла.
– А вось так, – Страх задаволена пачаў загінаць пальцы. – Уладальнік машыны заключае з намі дамову на страхаванне – раз. Плаціць пэўны ўзнос – два. Калі раптам здарэцца аварыя, наша страхавая кампанія выплачвае яму грашовую кампенсацыю – тры.





## Сакрэты ад Грошыка



**Забаўнае страхаванне**

У наш час кожны чалавек можа застрахавацца ад любых непрыемнасцяў у жыцці. Існуе страхоўка на выпадак, калі вы захраснулі ў ліфце альбо ў вас увялі сабаку падчас прагулкі. Аднак самы забаўны від страховак існуе ў Лондане. Адна з тутэйшых страхавых кампаній прапануе выплаціць грошы сваім кліентам у выпадку, калі іх выкрадуць з Зямлі іншапланецяне.

– А калі нічога не здарыцца, што тады? – спытаў Янка.

– Тады мы вас віншуем. А ваш узнос застанецца ў агульнай нашай скарбонцы. І падтрымае тых, хто трапіў у бяду.

– О, дык вы, дзядзечка Страх, сапраўды спагадлівы для вадзіцеляў.

– Ды мы ўсім можам аказваць паслугі. Нават табе, малады чалавек.

– Як гэта?

– Мы можам застрахаваць твой мабільны тэлефон, камп'ютар. Цябе самога са згоды бацькоў. Вашу кватэру, мэблю, дачу... – у Страха нават не хапіла пальцаў на руках, каб пералічыць усе віды страхавання.

## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся, як называецца дакумент, які сведчыць, што вы маеце страхоўку.






Грошык задаволена слухаў урок Страха і радаваўся, што яго вучань даведаўся нешта новае пра ролю грошай у страхаванні.

А Страх не хацеў адпускаць ад сябе такіх зацікаўленых кліентаў. Ён падліў Грошыку і Янку бярозавіку і распавёў пра страхаванне абавязковае і добраахвотнае.

– Глядзіце, колькі машын на дарогах. Іх з кожным годам усё болей, – нагадаў Страх. – І дзяржава абавязвае ўсіх уладальнікаў набываць страхоўку. Калі хто не зробіць гэтага, даішнікі могуць такога вадзіцеля штрафаваць. Абавязкова трэба купляць страхоўкі тым, хто едзе за межы краіны.

Янка асабліва дзівіўся, калі Страх расказваў пра добраахвотнае страхаванне. Адзін спявак застрахаваў свой голас, артыст балета – ногі, скрыпач – рукі, акадэмік – сваё здароўе.

– А я папрашу маму і тату, – паабяцаў Янка Страху, – каб застрахавалі сабачку Боньку. Ён такі маленькі, даверлівы. Баюся, каб на вуліцы ніхто не пакрыўдзіў яго, каб не згубіўся.

# 12. САМЫ ВЯЛІКІ КАШАЛЁК





Грошык урачыста абвясціў:

– А зараз, Яначка, твае запытаначкі скончыліся. Я правяду экзамен: што ты запомніў з маіх урокаў? Якія твае фінансавыя веды?

Янка крыху напалохаўся. Прывык пра ўсё распытваць Грошыка, а цяпер самому трэба адказваць. Пра што ж гэты чарадзей запытае?

Грошык зрабіў так, як школьны настаўнік. Расклаў на стале білеты і загадаў:

– Цягні! Выбірай любы!



## Школка Грошыка

**1.** З якіх дзвюх грашовых частак складваецца бюджэт краіны?

**2.** Што азначае дэфіцыт і прафіцыт бюджэту?

**3.** Для чаго трэба ведаць фінансавую азбуку ад А да Я?

Янка паглядзеў на паперкі з нумарамі і ўзяў з лічбай 10 – якраз столькі яму гадоў.

Хлопчык прачытаў заданне білета: «Хто валодае самым вялікім кашальком у краіне? Адкуль бяруцца грошы ў той скарбонцы? Як і хто іх траціць?». Задумаўся. Пачаў разважаць.

Пра гэта нібыта ніколі не гаварылі з Грошыкам. Пра кашалёк сямейны і Янкаў асабісты гаворку вялі. Абмяркоўвалі, як эканоміць грошы, як іх вырошчваць у банку. Янка ведаў пра крэдыты, плацежныя карткі, аблігацыі, інвестыцыі. Бачыў, як робяць грошы. Быў у банкаўскім музеі. Цікава, а ў каго ж самы тоўсты кашалёк, хто ім валодае?

# Школка Грошыка

Як вы разумееце прымаўкі?

- У каго грошы – у таго розум.
- Хто не мае, той не траціць.
- Рубель без капейкі не бывае.

Янка зірнуў на спакойнага Грошыка і пазайздросціў яму: «От бы займець такі самы, як у яго, таямнічы кошык. Націснуў кнопку – і слухай гатовенькі адказ».

Цяпер Янка зразумеў, што ў жыцці не заўсёды ёсць казачныя кнопкі. Трэба думаць сваёй галавой. Трэба самому шукаць і знаходзіць адказы на ўсе пытанні.

– Ну, Янка, дзесяць хвілін прайшлі. Слухаю цябе, – сказаў Грошык і пільна зірнуў у вочы свайму вучню.

Янка напружыўся, гарачым цяплом ахутаўся ўвесь твар, і ён пачаў разважаць:

– Я думаю, што няма такога чалавека, які б меў вялізны кашалёк і валодаў усімі грашыма адзін. Нават багацей, мільянер ці мільярдэр не можа захапіць увесь капітал.





Грошык маўчаў, але Янка адчуў, што настаўніку падабаецца яго роздум. Ды ўсё-ткі ён чакае больш дакладнага тлумачэння. І Янка прадаўжаў:

– Калі адзін чалавек ці нават група людзей не могуць мець усіх грошай, то агульны капітал краіны знаходзіцца ў банках і ў людзей. Вось у каго самы галоўны грашовы кашалёк!

Грошыку падабалася, як яго вучань лагічна развівае сваю думку. Ён памкнуўся нешта падказаць яму, але Янка апярэдзіў:

– Я думаю так: калі ў кожнай сям'і ёсць бюджэт, то і дзяржава павінна мець свой бюджэт.

– Правільна, мой разумнік! – пахваліў Грошык свайго вучня. – Слова «бюджэт» – замежнае слова. І яно абазначае «кашалёк», «сумка», «скураны мех з грашыма».





## Школка Грошыка

Разгадаўшы рэбус, вы даведаецеся, як называецца працэс, калі мяняюцца купюры.




**Дэнамінацыя** – адбываецца тады, калі грошай шмат, але іх вартасць нізкая, за іх мала што можна купіць. Тады змяняецца вартасць грашовых знакаў, каб нацыянальная валюта стала больш стабільнай і каб прасцей было разлічвацца з гандлярамі.

# Сакрэты ад Грошыка

**Што такое інфляцыя?**

Часам мы назіраем, як цэны на некаторыя тавары паступова растуць. Напрыклад, за адну і тую суму грошай праз пэўны час мы зможам купіць ужо меншую колькасць порцый марожанага. Гэта значыць, што грошы губляюць пакупніцкую здольнасць, абясцэньваюцца. Такі працэс называецца інфляцыяй. Сам тэрмін паходзіць ад лацінскага слова inflatio – «узняцце». І сапраўды, пры высокіх тэмпах інфляцыі грашовая маса ўзнімаецца, нібыта мыльная бурбалка.





**Падатак** – абавязковы грашовы збор, які вызначаецца дзяржавай. Падаткі ад прадпрыемстваў і працаўнікоў папаўняюць бюджэт краіны. Гэты бюджэт і ёсць галоўны «кашалёк», з якога аплачваюцца ўсе выдаткі на ўтрыманне школ, дзіцячых садкоў і ўсіх жыццёва важных праграм нашай дзяржавы.

Фінансавая азбука



**Пенсія** – грошы, якія дзяржава кожны месяц выплачвае пажылым людзям – пенсіянерам. Яны доўга працавалі і дасягнулі пенсійнага ўзросту. Пенсія выплачваецца з фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Сума пенсіі залежыць ад таго, колькі чалавек працаваў, якую займаў пасаду і якую атрымліваў зарплату.

Янка ажывіўся:

– Ды я глядзеў па тэліку, як дэпутаты абмяркоўвалі бюджэт на новы год. Спрачаліся, каму болей грошай даць: ці школам, ці эмчээсаўцам, ці арміі...

– О, дык ты і такія перадачы глядзіш! – здзівіўся Грошык.

– Ты ж сам казаў, што твая школка сур'ёзная, рыхтуе нас, дзяцей, да вялікага жыцця.

– Ага, казаў, – пагадзіўся Грошык і хітравата ўсміхнуўся. – Калі ты такі падрыхтаваны, то падумай, з якіх грошай складваецца бюджэт краіны.

Янка пачухаў галаву, як гэта ўмее рабіць Грошык, зірнуў уверх, нібыта там быў адказ, і пачаў гаварыць:

– Я думаю так. Бацькі мае плацяць дзяржаве падаткі. І арганізацыі, дзе яны працуюць, таксама плацяць. І ўсе так робяць. Атрымліваецца ого-го якая сума! Грошы гэтыя залічваюцца ў бюджэт краіны. Яшчэ туды ідуць усялякія пошліны, інвестыцыі, арэнды. А банкі спрыяюць, каб грошы выгадна працавалі.





## Фінансавая азбука



**Фінансы** – усе грошы, якія мае краіна, прадпрыемства ці асобная сям'я. Дзяржаўныя фінансы – гэта сукупнасць усіх грашовых сродкаў, якія маюцца ў дзяржавы.

**Эканоміка** – структура і стан гаспадаркі дзяржавы, узровень усяго гаспадарчага жыцця краіны. Чым вышэйшы ўзровень эканомікі, тым лепшыя зарплаты ў працаўнікоў, а значыць, больш заможнае жыццё. Таксама эканомікай называецца навука, якая дае тлумачэнні ўсіх законаў фінансава-матэрыяльнай дзейнасці.

Грошык ажно запляскаў у ладкі.

– Выдатна!.. Цябе можна запісваць у фінансісты, эканамісты, банкіры...

Янка сарамліва пачырванеў:

– Мне яшчэ вучыцца і вучыцца...

– Дык вось што, – прапанаваў Грошык. – Я гатовы прадоўжыць урокі з табой па фінансавай грамаце. А за твой сённяшні адказ стаўлю табе найвышэйшую адзнаку – дзесяць балаў.

Грошык паціснуў Янку руку і ўручыў яму кнігу «Грошык і таямнічы кошык».






**«Сусветная спадчына ЮНЕСКА. Мірскі замак». 20 рублёў**







**«Грунвальдская бітва. 600 год». 20 рублёў**




**«Стрэчанне. Звычаі і абрады народаў краін ЕўрАзЭС». 20 рублёў**




**«Купалле». 20 рублёў**




**«120-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы». 10 рублёў**




**«Рысь». 50 рублёў**






«65 год вызвалення Беларусі
ад нямецка-фашысцкіх
захопнікаў».
20 рублёў




«Славянка». 50 рублёў




«Сымон-музыка».
20 рублёў




«Прападобная
Еўфрасіння Полацкая». 50 рублёў




«Белавежская пушча. Зубр». 50 рублёў




«Фарны касцёл. Нясвіж». 20 рублёў



**Уладзімір Ліпскі – пісьменнік, галоўны рэдактар часопісаў для дзяцей «Вясёлка» і «Буся», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Аўтар шматлікіх кніг для юных і дарослых чытачоў.**

**«Грошык і таямнічы кошык» – новы праект аўтара на заказ «Беларусбанка». Герой аповесці Грошык знаёміць дзяцей са сваімі прыгодамі ў Краіне фінансаў, дае ўрокі фінансавай адукацыі, знаёміць з грашовай энцыклапедыяй.**

**Кніга цікавая, патрэбная для сямейнага чытання, для правядзення гутарак у школах і дзіцячых садках.**

ISBN 978-985-471-999-3

9 789854 719993

6+